ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 28 (2081)
5 красавіка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПАСТАНОВА XXIII З'ЕЗДА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА ПА СПРАВАЗДАЧНАМУ ДАКЛАДУ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПСС

Заслухаўшы і абмеркаваўшы Справаздачны даклад Першага сакратара ЦК КПСС таварыша Брэжнева Л. І. аб рабоце Цэнтральнага Камітэта КПСС, XXIII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза пастанаўляе:

цалкам і поўнасцю адобрыць палітычную лінію і практычную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта КПСС;

адобрыць прапановы і вывады, якія змяшчаюцца ў Справаздачным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС.

ПАСТАНОВА XXIII З'ЕЗДА КПСС ПА СПРАВАЗДАЧЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ КПСС

Справаздачу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС зацвердзіць.

XXIII З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

МАСКВА, КРЭМЛЬ

31 сакавіка, 1, 2 і 4 красавіка XXIII з'езд партыі працягваў абмяркоўваць справаздачныя даклады Цэнтральнага Камітэта і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС.

На вячэрнім пасяджэнні 31 сакавіка выступілі таварышы: В. В. Мацкевіч — міністр сельскай гаспадаркі СССР, З. Н. Нурыеў — першы сакратар Башкірскага абкома КПСС, А. Г. Бузніцкі — старшыня калгаса імя Жданава Міронаўскага раёна (Кіеўская партарганізацыя).

Затым з'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных партый: таварышы Луіджы Лонга — Генеральны сакратар Італьянскай Камуністычнай партыі, Тодар Жыўкаў — Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Балгарскай Камуністычнай партыі, Арманда Харт Давалос — член Палітбюро, сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Кубы, Далорэс Ібаруры — Старшыня Камуністычнай партыі Іспаніі.

Ранішняе пасяджэнне 1 красавіка, якое адкрылася пад старшынствам П. Я. Шэлеста, пачалося выступленнем першага сакратара Свярдлоўскага абкома КПСС К. К. Нікалаева.

Распрацаваныя партыяй на апошніх Пленумах ЦК меры па далейшаму ўдасканальванню арганізатарскай і эканамічнай работы, падкрэслівае ён, знайшлі ўсюды гарачую падтрымку.

Слова даецца кандыдату ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, старшыні ВЦСПС В. В. Грышыну.

Наша партыя, гаворыць ён, ставіць сваёй важнейшай задачай шляхам тэхнічнага прагрэсу, індустрыяльнага развіцця ўсёй грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці забяспечыць далейшы значны рост прамысловасці і сельскай гаспадаркі і на гэтай аснове — далейшы уздым жыццёвага ўзроўню народа.

На трыбуне іванаўская ткачыха З. П. Пухава. Яе выступленне прасякнута дзяржаўным клопатам аб тым, каб для народа выпускаць больш добраякасныя тканіны, лепш выкарыстоўваць вытворчыя магутнасці тэкстыльных прадпрыемстваў і асабліва новага абсталявання.

Выступае пісьменнік М. А. Шолахаў. (Яго выступленне друкуецца ў гэтым нумары нашай газеты).

Славутага пісьменніка на трыбуне змяняе знатны данецкі гарняк—брыгадзір комплекснай брыгады з шахты імя Касіёра Луганскай вобласці С. І. Варатнікоў.

Першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Азербайджана В. Ю. Ахундаў і першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Туркменіі Б. Авезаў у сваіх выступленнях расказалі пра жыццё і працу азербайджанскага і туркменскага народаў. Яны гаварылі таксама аб праблемах больш поўнага выкарыстання багатых прыродных рэсурсаў гэтых рэспублік.

На вячэрнім пасяджэнні, якое адкрылася пад старшынствам П. Н. Дзёмічава, першы выступіў прэзідэнт Акадэміі навук СССР М. У. Келдыш, які расказаў з'езду аб поспехах савецкай навукі і яе важнейшых праблемах.

Затым слова было прадастаўлена міністру абароны СССР маршалу Р. Я. Маліноўскаму, прамова якога неаднаразова перапынялася апладысментамі.

На ранішнім пасяджэнні 1 красавіка з прывітаннямі з'езду выступілі кіраўнікі дэлегацый брацкіх камуністычных партый, горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі,—член Палітбюро, намеснік Старшыні Цэнтральнага Камітэта Працоўнай партыі Карэі Цой Ен Ген, Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Мангольскай народна-рэвалюцыйнай партыі Юмжагійн Цэдэнбал і член Цэнтральнага Камітэта Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама Нгуен Тхі Бінь. Нгуен Тхі Бінь перадала з'езду сцяг, як сімвал салідарнасці і непарушнай дружбы змагаючагася народа Паўднёвага В'етнама і народаў Савецкага Саюза.

З'езд нашай партыі ў свеце называюць сёння падзеяй нумар адзін. Чаму з'езд савецкіх камуністаў хвалюе людзей працы ў капіталістычных краінах, гэта панамскі камуніст Рубен Кастэльянас растлумачыў коратка: вашы поспехі — зарука нашых перамог. Гаворка ідзе аб перамогах у барацьбе за нацыянальную незалежнасць народаў, за сацыялізм, за мір.

Пра мір, пра мірную знешнюю палітыку партыі, Савецкай Дзяржавы на пасяджэнні з'езда, якое адкрылася 2 красавіка пад старшынствам Д. Ф. Усцінава, гаварыў міністр замежных спраў А. А. Грамыка.

Моладзь — будучыня краіны, яе надзея. І ў многіх выступленнях на з'ездзе праяўляецца чулая ўвага да яе, клопаты аб яе выхаванні, працы, адукацыі і адпачынку. Гэтым праблемам была прысвечана прамова першага сакратара ЦК ВЛКСМ С. П. Паўлава.

Раніцай 2 красавіка жанчыны-дэлегаты з'езда прыйшлі ў залу з букетамі чырвоных гваздзікаў. Гэты «сакрэт» высветліўся, калі старшынствуючы зачытаў запіску, якая паступіла ў прэзідыум з'езда:

— Мы, жанчыны, дэлегаты XXIII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза выказваем глыбокую падзяку французскім таварышам за прысланыя імі ў Палац з'ездаў кветкі. Усе жанчыны жадаюць ад душы, каб на зямлі былі мір і дружба. Няхай заўсёды цвітуць на ўсёй зямлі чырвоныя гваздзікі і ніколі не будзе шугаць атамнае полымя. Няхай жыве мір!

З'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі Першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Германіі Макс Рэйман, кіраўнік дэлегацыі Камуністычнай партыі ЗША Генры Уінстан, Старшыня Камуністычнай партыі Аргенціны Вікторыо Кадовілья, Старшыня ЦК Камуністычнай партыі Аўстраліі Рычард Дзіксан, Першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Грэцыі Костас Каліяніс і Першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Уругвая Радней Арысмендзі.

Шмат на з'ездзе бывае хвалюючых момантаў, калі мімаволі часцей б'ецца сэрца. Так было і 4 красавіка ў пачатку ранішняга пасяджэння, калі старшынствуючы Ш. Р. Рашыдаў зачытаў пісьмо нашых пакарыцеляў космасу—вучоных, канструктараў, інжынераў, тэхнікаў, рабочых. Яны дакладваюць з'езду, што выведзеная на калямесяцавую арбіту аўтаматычная станцыя «Месяц-10» стала першым штучным спадарожнікам Месяца. Свой навуковы і тэхнічны подзвіг стваральнікі станцыі прысвяцілі XXIII з'езду партыі неўміручага Леніна.

З'езд прымае прывітанне пакарыцелям касмічнай прасторы.

Старшынствуючы аб'яўляе:

— Прашу праслухаць перададзеную з борта штучнага спадарожніка Месяца мелодыю партыйнага гімна «Інтэрнацыянал»!

І ў наступіўшай цішыні льюцца ўрачыста-велічныя гукі Гімна партыі, Гімна сусветнага пралетарыяту. Прысутныя слухаюць стоячы, з хваляваннем. Калі закончыўся Гімн, перададзены з космасу, у зале зноў узнікае бурная авацыя.

Затым па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта КПСС і Справаздачнаму дакладу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС выступілі таварышы: К. І. Галаншын—першы сакратар Пермскага абкома КПСС, А. А. Епішаў — начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, А. А. Кокараў — першы сакратар Краснаярскага крайкома КПСС, Л. А. Сысоева — работніца саўгаса «Звянігарадскі» (Маскоўская абласная партарганізацыя).

З'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных партый: таварышы Віле Песі—Генеральны сакратар Камуністычнай партыі Фінляндыі, Альвара Куньял — Генеральны сакратар Партугальскай Камуністычнай партыі.

Далей у абмеркаванні Справаздачнага даклада Цэнтральнага Камітэта КПСС і Справаздачнага даклада Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС прынялі ўдзел таварышы: А. Ф. Яштокін — першы сакратар Кемераўскага абкома КПСС, Л. А. Куліджанаў — першы сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў СССР, А. А. Скачылаў — першы сакратар Ульянаўскага абкома КПСС.

Горача сустрэлі дэлегаты і госці прадстаўнікоў зарубежных камуністычных партый: таварышаў Левадзі — Старшыню Паўднёва-Афрыканскай Камуністычнай партыі, Уільяма Каштана — Генеральнага сакратара Камуністычнай партыі Канады, якія выступілі з прывітаннямі з'езду.

На вячэрнім пасяджэнні ў спрэчках па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта КПСС і Справаздачнаму дакладу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі выступіў тав. Н. Н. Радзіёнаў—першы сакратар Чэлябінскага абкома КПСС.

Затым у залу ўваходзіць з ваеннымі сцягамі дэлегацыя Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Ад імя салдат і матросаў, сержантаў і афіцэраў, генералаў і адміралаў, усіх воінаў Савецкай Арміі і Флоту XXIII з'езд КПСС вітае камандзір гвардзейскай Таманскай мотастралковай дывізіі імя М. І. Калініна Герой Савецкага Саюза генерал-маёр І. І. Ценішчаў.

З'езд прымае рашэнне аб спыненні спрэчак па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта КПСС і Справаздачнаму дакладу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС.

З заключным словам выступіў горача сустрэты дэлегатамі і гасцямі тав. Л. І. Брэжнеў.

Па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта КПСС з'езд аднагалосна прыняў пастанову.

З'езд выбраў камісію па падрыхтоўцы рэзалюцыі XXIII з'езда КПСС па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта КПСС.

З'езд аднагалосна зацвердзіў Справаздачны даклад Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС.

Затым з прывітаннямі з'езду выступілі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных і рабочых партый таварышы: Хесус Фарыа—Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Венесуэлы, Хільберта Віейра—Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Калумбіі, Кнуд Есперсен — Старшыня Камуністычнай партыі Даніі, Эзекіяс Папаіаану — генеральны сакратар Прагрэсіўнай партыі працоўнага народа Кіпра, Рэйдар Ларсен — Старшыня Камуністычнай партыі Нарвегіі, Эрнест Бюрнель — Старшыня Камуністычнай партыі Бельгіі, Арнольда Мартынес Вердуга — Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Мексіканскай камуністычнай партыі, Мадэйра Кейта — член Нацыянальнага палітбюро партыі Суданскі саюз рэспублікі Малі.

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА ТАВАРЫША Л. І. БРЭЖНЕВА

Таварышы дэлегаты, на нашым з'ездзе па Справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта партыі выступілі дэлегаты ад камуністычных партый усіх нашых саюзных рэспублік, якія ўтвараюць вялікую многанацыянальную Савецкую Радзіму, прадстаўнікі партыйных арганізацый гарадоў-герояў Масквы і Ленінграда, пасланцы партыйных арганізацый Урала і Сібіры, Паволжа і Далёкага Усходу і рада іншых краёў, абласцей і аўтаномных рэспублік Расійскай Федэрацыі.

З трыбуны з'езда мы чулі слова перадавых рабочых і калгаснікаў, інжынераў і вучоных, дзеячоў літаратуры і мастацтва, партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных і камсамольскіх кіраўнікоў.

Паўнамоцныя прадстаўнікі дванаццацімільённай ленінскай партыі глыбока і па-дзеламу абмеркавалі важнейшыя пытанні жыцця партыі і краіны, вынікі пройдзенага шляху і планы на будучыню.

Калі ў самых кароткіх словах ахарактарызаваць галоўныя рысы, якія вызначалі гэтыя выступленні, то можна сказаць так:

гэта — поўнае адзінства з'езда вакол палітычнай лініі Цэнтральнага Камітэта як ва ўнутраных, так і ў знешніх справах **(апладысменты);**

гэта — гарачая бальшавіцкая інтэрнацыянальная салідарнасць з усімі краінамі сацыялізма, з камуністамі ўсяго свету, з усімі барацьбітамі супраць імперыялізму **(апладысменты);**

гэта, нарэшце, — сапраўдны партыйны дух таварыскасці і сур'ёзнай патрабавальнасці да самíх сябе і іншых у імя перамогі нашай агульнай справы, — словам, добры дзелавы настрой перадавога атрада велізарнай арміі будаўнікоў камунізма. **(Апладысменты).**

Гэта вельмі добра, таварышы. Гэта паказчык высокай палітычнай сталасці нашай партыі. **(Працяглыя апладысменты).**

Выступаўшыя дэлегаты з'езда не толькі актыўна падтрымлівалі палітыку ЦК, але і развівалі яе, дапоўніўшы і ўзбагаціўшы справаздачу Цэнтральнага Камітэта вялікім фактычным матэрыялам і пастаноўкай рада новых важных пытанняў.

Выступленні ўсіх таварышаў на з'ездзе, такім чынам, зліліся ў адно са Справаздачным дакладам Цэнтральнага Камітэта, паказаўшы дзейнасць нашай партыі ва ўсёй яе шырыні, ва ўсёй шматграннасці. **(Апладысменты).**

Усё гэта, таварышы, і вызваляе мяне ад больш падрабязнага заключнага слова. **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Усе ўстаюць).**

ПІСЬМЕННІКІ—КАНДЫДАТЫ Ў САСТАЎ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

Як паведамлялася ў друку, ад пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі ў састаў выбарчай камісіі Беларускай ССР па выбарах у Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР вылучаны намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі І. П. Шамякін.

Першага красавіка адбыўся сход пісьменнікаў Мінска, на якім кандыдатам у састаў Мінскай першай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Савет Саюза Вярхоўнага Савета СССР (выбарчая акруга № 591) вылучаны І. П. Мележ.

ПРАМОВА ТАВАРЫША П. М. МАШЭРАВА

(Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі)

Таварышы! Наша партыя, вялікая партыя камуністаў-ленінцаў, з усёй пераканаўчасцю дэманструе на XXIII з'ездзе сваю ўзросшую магутнасць і згуртаванасць, свае непахісна трывалыя сувязі з народам.

Гісторыя не ведае такой палітычнай арганізацыі, якая па сіле і глыбіні свайго ўплыву на ход грамадскага развіцця магла б параўнацца з Камуністычнай партыяй, створанай і загартаванай вялікім Леніным.

З велізарнай увагай выслухалі мы Справаздачны даклад ЦК КПСС, з якім выступіў Першы сакратар ЦК таварыш Брэжнеў. Характэрнай асаблівасцю даклада з'яўляецца дзелавы тон і глыбокі аналіз жыццёва важных пытанняў, навуковы і рэалістычны падыход да вырашэння задач, якія стаяць перад партыяй і краінай.

Вялікія поспехі, дасягнутыя партыяй і савецкім народам, сапраўды грандыёзныя перспектывы, аб якіх гаварылася ў Справаздачы Цэнтральнага Камітэта, радуюць нас і натхняюць. Вельмі важна, што гэтыя перспектывы знаходзяць сваё выражэнне ў рэальных, навукова абгрунтаваных планах развіцця народнай гаспадаркі краіны. Бясспрэчна, ажыццяўленне іх дазволіць Савецкаму Саюзу зрабіць новы вялікі крок наперад па шляху стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

Камуністы, працоўныя Беларусі, як і ўвесь савецкі народ, горача адабраюць і аднадушна падтрымліваюць унутраную і знешнюю палітыку партыі, палітычную лінію і практычную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта КПСС, якія цалкам і поўнасцю адпавядаюць карэнным інтарэсам савецкага народа.

Мы поўнасцю адабраем дзейнасць ЦК нашай партыі, накіраваную на развіццё садружнасці краін сацыялістычнага лагера і згуртаванне міжнароднага камуністычнага руху. Зусім правільнай, паленінску прынцыповай з'яўляецца пазіцыя, занятая ЦК КПСС ва ўзаемаадносінах з кіраўніцтвам КПК.

У Справаздачы Цэнтральнага Камітэта знайшлі сваё адлюстраванне і далейшае развіццё асноўныя палажэнні, пастаўленыя кастрычніцкім (1964 г.) і наступнымі Пленумамі ЦК КПСС. Рашэнні гэтых Пленумаў маюць вялікае тэарэтычнае і велізарнае практычнае значэнне. Яны накіраваны на ўдасканаленне партыйнага кіраўніцтва палітычным, гаспадарчым і культурным жыццём краіны, на развіццё і строгае захаванне ленінскіх норм партыйнага жыцця, ажыўленне ўсёй арганізатарскай і палітычнай работы партыі.

Выконваючы гэтыя рашэнні, Кампартыя Беларусі, як адзін з баявых атрадаў КПСС, прыйшла да XXIII з'езда вырасшай і загартаванай, узбагачанай новым вопытам палітычнага і арганізатарскага кіраўніцтва, цесна згуртаванай вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта нашай партыі. **(Апладысменты).**

Кіруючыя органы і партыйныя арганізацыі рэспублікі ўдзяляюць неаслабную ўвагу ўдасканаленню стылю і метадаў сваёй арганізатарскай і палітычнай работы з людзьмі. Мы асаблівае значэнне надаём павышэнню ўзроўню ідэалагічнай работы, узмацненню выхавання камуністаў і шырокіх мас працоўных, паляпшэнню дзейнасці пярвічных партарганізацый.

Ажыццяўленне прапанаваных дапаўненняў і змен Статута КПСС бясспрэчна паслужыць далейшаму ўмацаванню партыйнай дысцыпліны, павышэнню ў кожнага камуніста пачуцця адказнасці за чысціню высокага звання члена партыі, узняццю баяздольнасці партыйных арганізацый.

Побач з узмацненнем ролі парторганізацый у гаспадарчых справах, мы лічым, што яны павінны больш увагі ўдзяляць пытанням ідэйна-палітычнай работы, паглыбляць і ўдасканальваць яе.

Нельга сказаць, што намі поўнасцю выпраўлены тыя недахопы, якія былі абумоўлены допушчанай у свой час недаацэнкай ідэалагічнай работы, пытанняў прапаганды марксісцка-ленінскай тэорыі.

Цяпер у партыі і краіне створана вельмі добрая абстаноўка для правядзення дзейснай разнабаковай ідэалагічнай работы. Гэта дае нам магчымасць больш паспяхова вырашаць задачы па выхаванню ва ўсіх нашых людзей глыбокіх камуністычных перакананняў, рыхтаваць іх да новых працоўных, а калі спатрэбіцца, то і да ратных подзвігаў.

Партыйныя арганізацыі рэспублікі актывізавалі работу па выкрыццю буржуазнай ідэалогіі, прывіццю кожнаму чалавеку пачуцця высокай класавай самасвядомасці і палымянага савецкага патрыятызму. Асаблівую ўвагу пры гэтым мы ўдзяляем выхаванню працоўных на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях Камуністычнай партыі і савецкага народа. У сувязі са святкаваннем 20-годдзя вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх акупантаў і 20-годдзя перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне гэта работа ўзбагацілася значным вопытам, стала больш разнастайнай па форме і глыбокай па зместу.

Прайшоўшыя святкаванні Перамогі і Дні памяці загінуўшых герояў яшчэ раз ва ўсёй велічы раскрылі душэўную прыгажосць нашага савецкага чалавека, прадэманстравалі непарушную дружбу і згуртаванасць народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы, аказалі дабратворны ўплыў на моладзь. Нашы юнакі і дзяўчаты, глыбей усвядоміўшы веліч подзвігу, які здзейснілі іх бацькі і маці ў славу свайго народа, пачалі яшчэ больш паважаць бацькоў і самíх сябе.

Шырокае распаўсюджанне набылі ў Беларусі такія масавыя мерапрыемствы, як святы працы, якія добра ўспрыняты народам і з'яўляюцца ўдалай формай палітычнага выхавання працоўных.

Велізарнае значэнне ў выхаваўчай рабоце маюць літаратура і мастацтва. Аддаючы належнае бясспрэчным поспехам, якіх дасягнула наша творчая інтэлігенцыя, мы, партыйныя работнікі, не можам маўчаць і аб тым, што некаторыя літаратары, як справядліва сказана ў Справаздачным дакладзе ЦК, у сваіх творах ганяць гераічнае мінулае савецкіх людзей, чэрняць савецкую рэчаіснасць. Выклікае здзіўленне, з якой паспешлівасцю і лёгкасцю часам слабыя ў ідэйных і мастацкіх адносінах, а іншы раз проста шкодныя творы публікуюцца на старонках папулярных часопісаў і выпускаюцца асобнымі выданнямі. А ўзначальваюць жа гэтыя часопісы і выдавецтвы камуністы. Дзе ж іх партыйная прынцыповасць і адказнасць перад партыяй і народам? **(Апладысменты).**

Беларускі народ высока цэніць і свята ахоўвае найвялікшую заваёву Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы — трывалую, непарушную дружбу народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы. Імена ў гэтым працоўныя рэспублікі бачаць залог сваіх поспехаў, крыніцу сілы і магутнасці сваёй сацыялістычнай Бацькаўшчыны — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Як у часіну цяжкіх выпрабаванняў, так і ў пару радаснага стварэння беларускі народ заўсёды атрымліваў і атрымлівае шчодрую дапамогу ад рускага і іншых народаў Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну Савецкая Армія, у радах якой змагаліся лепшыя сыны народаў-братоў, прынесла нашай рэспубліцы вызваленне ад акупантаў. На беларускай зямлі ў партызанскіх злучэннях тры гады запар самааддана змагаліся з ворагам разам з беларусамі рускія, украінцы, грузіны, казахі, прадстаўнікі іншых народаў нашай краіны. І цяпер, ва ўмовах мірнага жыцця, на кожным прадпрыемстве, у кожным вырабе, у кожным метры тканіны, створаных у Беларусі, моцна перапляліся ніці вялікай дружбы, цесных сувязей, якія ўзаемна ўзбагачаюць народы нашай Радзімы.

У гэтыя дні ў Расійскай Федэрацыі праходзіць фестываль беларускага мастацтва. Лепшыя творчыя калектывы Беларусі паехалі на Урал і ў Сібір, у гэтыя цудоўныя краі зямлі рускай, не толькі для таго, каб пазнаёміць сібіракоў і ўральцаў з мастацтвам свайго народа, але і сказаць сардэчнае беларускае дзякуй, выказаць пачуцці брацкай дружбы, глыбокай павагі і ўдзячнасці народам вялікай маці-Расіі. **(Апладысменты).**

Развіццё эканомікі краіны ў цэлым, паспяховае вырашэнне ўсіх агульнасаюзных задач знаходзяць сваё найлепшае спалучэнне з інтарэсамі гарманічнага развіцця народнай гаспадаркі саюзных рэспублік. Гэта з'яўляецца канкрэтным праяўленнем вялікай жыццёвай сілы ленінскай нацыянальнай палітыкі, якую праводзіць наша партыя, яе Цэнтральны Камітэт.

У агульнай сістэме народнай гаспадаркі СССР паспяхова развівалася і эканоміка Беларусі, якая за небывала кароткі тэрмін набрала высокія тэмпы. За мінулае сямігоддзе дзяржаўныя капітальныя ўкладанні ў народную гаспадарку рэспублікі склалі 5,7 мільярда рублёў і былі ў 1,6 раза большыя, чым за папярэднія 15 гадоў. На новую пяцігодку яны вызначаны ў 5,5 мільярда рублёў, што на 84 працэнты перавышае капіталаўкладанні за апошнія пяць гадоў.

Прамысловасць рэспублікі датэрмінова, яшчэ ў маі 1965 года, выканала сямігадовы план, падвоіўшы выпуск прадукцыі. Хімічная і металаапрацоўчая прамысловасць, машынабудаванне павялічылі выпуск прадукцыі ў 3,4 раза. Больш чым у тры разы ўзрасла выпрацоўка электраэнергіі. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці рэспублікі павысілася ў паўтара раза, выпушчана звышпланавай прадукцыі на мільярды рублёў.

Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў калгасах і саўгасах рэспублікі за гады сямігодкі ўзрасла ў 1,7 раза, у тым ліку жывёлагадоўлі—у 2,1 раза. Павысілася таварнасць калгаснай і саўгаснай вытворчасці. Рэспубліка больш чым у два разы павялічыла продаж дзяржаве збожжа, малака, яек, амаль у два разы—бульбы і больш чым у паўтара раза—мяса і агародніны. Амаль падвоіліся грашовыя даходы калгасаў, і ў два з лішнім раза ўзрасла аплата працы калгаснікаў.

У прамысловай вытворчасці рэспублікі за апошнія гады адбыліся вялікія якасныя, структурныя змены. Шырокае развіццё, напрыклад, набылі такія важныя галіны, як хімічная, нафтаперапрацоўчая, электратэхнічная, электроніка і прыборабудаванне. З'явіліся новыя прамысловыя цэнтры, рабочыя пасёлкі і гарады.

У сувязі з адкрыццём залежаў нафты ў рэспубліцы ствараецца нафтаздабываючая прамысловасць. Ёсць рэальная перспектыва на адкрыццё прамысловых залежаў вугалю, гаручых сланцаў, жалезнай руды, каляровых металаў.

За гады сямігодкі колькасць рабочых у прамысловасці Беларусі павялічылася на 64, а інжынерна-тэхнічных работнікаў—на 94 працэнты. І што вельмі важна, значна павысіўся іх прафесіянальны, агульнаадукацыйны і культурны ўзровень. У ВНУ і тэхнікумах рэспублікі за гэты час падрыхтавана 187 тысяч спецыялістаў народнай гаспадаркі і культуры.

Мы ўдзячныя партыйным арганізацыям Расійскай Федэрацыі, Украіны, Азербайджана і іншых рэспублік, якія чула аднесліся да нашых патрэб і дапамаглі неабходнымі кадрамі хімікаў, гарнякоў, нафтавікоў для наладжвання новых вытворчасцей і падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў на месцы.

Беларуская партыйная арганізацыя цалкам адабрае распрацаваныя Цэнтральным Камітэтам КПСС меры па паскарэнню тэмпаў росту грамадскай вытворчасці і павышэнню яе эфектыўнасці.

У святле рашэнняў верасвёўскага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС намаганні партыйных арганізацый накіраваны цяпер на распрацоўку і ажыццяўленне неабходнага комплексу мерапрыемстваў па планамернаму пераходу на новыя метады гаспадарання. На кожным прадпрыемстве ёсць нямала важных і складаных пытанняў, якія трэба зараз жа вырашаць, незалежна ад тэрмінаў пераходу на новую сістэму гаспадарання.

Нельга сказаць, што ў гэтых адносінах у нас робіцца ўсё як трэба. Ёсць пытанні, па якіх патрэбна дзелавая дапамога міністэрстваў і ведамстваў. Да такіх пытанняў адносяцца, у прыватнасці, арганізацыя рацыянальных гаспадарчых сувязей, удасканаленне планавання і ўнутрызаводскага гаспадарчага разліку, укараненне сістэмы навуковай арганізацыі працы і кіравання вытворчасцю.

На жаль, ёсць нямала выпадкаў, калі гаспадарчыя сувязі не толькі не ўдасканальваюцца, але і без падстаў парушаюцца. Вузкаведамасны падыход, імкненне мець у адной галіне ўсё або амаль усё з'яўляецца вельмі неразважнай і нават небяспечнай тэндэнцыяй.

У той жа час трэба ўмацоўваць дзяржаўную дысцыпліну і наводзіць строгі парадак у кааператыўных пастаўках. Узаемаадносіны паміж прадпрыемствамі павінны быць абумоўлены больш дакладнымі і строгімі патрабаваннямі і прынцыпамі. Пры шырокай сістэме каапеоравання, якая дзейнічае цяпер, вельмі часта парушаюцца тэрміны паступлення вырабаў, у радзе выпадкаў застаецца нізкай якасць загатовак, дэталей і вузлоў. Гэта ўносіць дэзарганізацыю ў работу прадпрыемстваў-спажыўцоў, робіць адмоўны ўплыў на іх эканамічныя паказчыкі, на якасць выпускаемай прадукцыі.

Наогул пытанні планамернага і бесперабойнага матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння чакаюць у будучым лепшага вырашэння.

Патрабуюць таксама асаблівай увагі далейшае ўсямернае ўмацаванне будаўнічай базы, нарошчванне тэмпаў вытворчасці будматэрыялаў. У Беларусі створаны магутныя будаўнічыя арганізацыі. Усе найбольш буйныя прамысловыя і іншыя аб'екты, якія будуюцца ў нас, здаюцца ў эксплуатацыю, як правіла, своечасова або датэрмінова. Але мы маем рэальную магчымасць значна скараціць тэрміны будаўніцтва, калі ўмацуем індустрыяльную базу будоўляў, палепшым забеспячэнне іх будматэрыяламі і праектнай дакументацыяй.

Выпуск будаўнічых матэрыялаў у рэспубліцы за сямігоддзе павялічыўся ў тры разы. Тым не менш іх не хапае. Разрыў, які ўтварыўся, можа аказацца ў далейшым яшчэ больш значным, асабліва калі ўлічыць узрослыя патрэбнасці жыллёвага будаўніцтва ў сельскай мясцовасці. Як вядома, будаўніцтва ў вёсцы жылля і іншых аб'ектаў, асабліва культурна-бытавога прызначэння, стрымліваецца, галоўным чынам, недахватам сценавых і дахавых матэрыялаў. Мы шукаем у рэспубліцы шляхі павелічэння вырабу цэглы, блокаў і іншых сценавых матэрыялаў. Аднак для перабудовы вёскі на належным узроўні і ў патрэбных маштабах гэтага недастаткова. Справу будаўніцтва ў сельскай мясцовасці час паставіць на больш сучасную, капітальную аснову, аб чым зусім правільна гаварылася ў Справаздачным дакладзе ЦК.

Рашэнні сакавіцкага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС, успрынятыя партыйнымі арганізацыямі і ўсімі працаўнікамі вёскі, як баявая праграма сваёй дзейнасці, зрабілі велізарны ўплыў на ўмацаванне эканомікі калгаснай і саўгаснай вытворчасці, павышэнне працоўнай актыўнасці калгаснікаў і рабочых саўгасаў.

У мінулым годзе ў сельскай гаспадарцы рэспублікі атрыманы самыя высокія паказчыкі ў параўнанні з папярэднімі гадамі. Вытворчасць збожжа, напрыклад, у калгасах і саўгасах павялічылася ў параўнанні з 1964 годам на 52, малака—на 29 і мяса—на 17 працэнтаў.

З'явілася новая група калгасаў і саўгасаў, якія атрымалі на сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў па 800 — 1.000 і больш цэнтнераў малака і па 100 і вышэй цэнтнераў мяса ў забойнай вазе.

Нашы кадры цалкам усведамляюць тое, што ўздым у сельскай гаспадарцы рэспублікі, які намеціўся, — гэта толькі пачатак вялікай справы. Трэба будзе правесці энергічную і творчую работу па далейшаму выкананню рашэнняў сакавіцкага Пленума ЦК КПСС па хутчэйшаму пераадоленню ўсё яшчэ наяўных сур'ёзных недахопаў як у кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, так і ў арганізацыі самой вытворчасці. Эканамічныя і палітычныя меры, намечаныя Цэнтральным Камітэтам КПСС, узяты ЦК курс на павелічэнне капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку з'яўляюцца правільнымі. Яны цалкам і аднадушна падтрымліваюцца ўсім народам.

Выключна важнае значэнне мае пытанне меліярацыі зямель. Ажыццяўленне шырокай праграмы меліярацыйных работ адкрывае для нашай рэспублікі новыя вялікія перспектывы. Асушаныя тарфянікі не выпадкова называюць у народзе залатым дном.

Я не буду спасылацца на даныя доследных станцый і найбольш высокія паказчыкі асобных гаспадарак у лепшыя ўраджайныя гады. Прывяду сярэднія за дзесяць гадоў ураджаі збожжа і бульбы на асушаных землях палескага саўгаса імя 10-годдзя БССР. Збожжавых і зернебабовых там атрымана 20 цэнтнераў, а бульбы — 204 цэнтнеры з гектара. Забяспечаныя дастатковай колькасцю калійных і фосфарных угнаенняў, асушаныя тарфяныя землі вызначаюцца вельмі высокай урадлівасцю. Само сабой зразумела, што выдзеленыя дзяржавай на меліярацыю сродкі дадуць хуткую аддачу. За пяцігоддзе намячаецца асушыць у рэспубліцы больш як 1,5 мільёна гектараў зямель. Мы спадзяёмся, што ў далейшым аб'ём гэтых работ узрасце.

Мы лічым таксама вельмі важным накіраваць максімум намаганняў і сродкаў на хутчэйшае вырашэнне такой вострай задачы, як задавальненне патрэб сельскай гаспадаркі ў неабходнай тэхніцы і мінеральных угнаеннях. Усе іншыя меры без гэтага могуць аказацца малаэфектыўнымі.

У перадз'ездаўскія дні ў Беларусі, як і ва ўсёй краіне, з вялікім уздымам прайшло ўсенароднае абмеркаванне праекта Дырэктыў XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану. Камуністы, усе працоўныя рэспублікі выказалі сваё поўнае і гарачае адабрэнне намячаемай партыяй праграмы вялікіх работ.

Калі яшчэ і яшчэ раз удумваешся ў Справаздачны даклад ЦК, калі ўяўляеш будучыню нашага народа і дзяржавы, то ўсведамляеш, што цяперашні XXIII з'езд КПСС увойдзе ў гісторыю, як той вышэйшы форум партыі, работа якога адзначана сапраўды ленінскай дзелавітасцю, прынцыповасцю і палітычнай мудрасцю ў вырашэнні вялікіх задач, якія стаяць перад нашай партыяй і краінай.

Камуністы Беларусі, увесь беларускі народ аддадуць усе свае сілы, веды і энергію ажыццяўленню рашэнняў XXIII з'езда КПСС, унясуць свой дастойны ўклад у вялікую справу камуністычнага будаўніцтва. **(Апладысменты).**

Прамовы друкуюцца з некаторымі скарачэннямі.

ПРАМОВА ТАВАРЫША М. А. ШОЛАХАВА

(Пісьменнік, Растоўская партарганізацыя)

Таварышы!

Як па асобных прытоках, поўных і своеасаблівай прывабнасці і рускай чароўнасці, нельга меркаваць пра ўсю захапляючую веліч Волгі, так і па асобных, разрозненых паведамленнях друку пра нашы працоўныя будні і дасягненні цяжка ўявіць грандыёзнасць размаху будаўніцтва і здзяйсненняў Радзімы.

Але вось калі мы збіраемся на наш з'езд партыі, калі слухаеш даклад і ўдумваешся ў лічбы, падсумаваную колькасць таго, што зрабілі за мінулыя гады народ і партыя,—вось тут і паўстае перад табою вынік тытанічнай работы, вось тут і адчуваеш усю магутнасць таго, што творыць народ у імя сваёй будучыні.

Але калі пасля лірычнага ўступу адразу перайсці да прозы, дык з усёй шчырасцю павінен заявіць—я зайздрошчу тым, хто з трыбуны з'езда можа сказаць пра вялікія поспехі ў той ці іншай галіне прамысловасці, навукі, адукацыі. Я выступаю тут як прадстаўнік савецкай літаратуры і павінен з горыччу сказаць пра тое, што поспехі ў нас, літаратараў, не такія вялікія, як таго б хацелася вам, чытачам, і самім нам, пісьменнікам. **(Апладысменты).**

Я не падзяляю аптымізму таго тульскага сакратара з анекдота, які на пытанне, як абстаіць справа з ростам літаратурных кадраў, адказаў: «Нармальна, нават добра! Калі раней у Тульскай губерні быў усяго толькі адзін пісьменнік—Леў Талстой, дык цяпер у нас 23 члены Тульскага аддзялення Саюза пісьменнікаў». **(Ажыўленне ў зале, смех, бурныя апладысменты).**

Колькасцю мы расцём, але, як гавораць кааператары, «прапануемая прадукцыя не зусім адпавядае іншы раз жадаемай кандыцыі». **(Ажыўленне ў зале, апладысменты).**

Безумоўна, з'явіліся за апошнія гады і добрыя кнігі. Яны ёсць—і ў паэзіі і ў прозе, але іх мала. Пра гэта сведчыць хоць бы той факт, што абмяркоўваемы цяпер спіс твораў, вылучаных на атрыманне Ленінскай прэміі, яўна беднаваты і, за выключэннем дзвюх-трох вартых кніг, астатнія наўрад ці вытрымліваюць тыя патрабаванні, якія павінны быць прад'яўлены нават пры першапачатковым абмеркаванні.

Гэта не застой. Пісьменнікі працуюць. Але значныя творы з'яўляюцца не штогод, ды было б і неапраўдана чакаць частага іх з'яўлення. Нават у такім шчодрым краі, як Краснадарскі, і то бываюць неўраджайныя гады і недароды. А што ж вы хочаце ад літаратуры? **(Ажыўленне ў зале, бурныя апладысменты).**

Што датычыць, напрыклад, літаратуры пра вайну, дык марудны рух яе тлумачыцца, на мой погляд, складанасцю самой тэматыкі. Ваенная мемуарная літаратура толькі за апошнія гады атрымала ў нас шырокае развіццё. Не выказаліся яшчэ многія нашы прызнаныя палкаводцы і ваенныя дзеячы, а напісаць жа ўспаміны значна лягчэй, чым аб'ёмны мастацкі твор. Не думайце, што я шукаю тут апраўданне сабе: пра вайну ж пішу не я адзін і будуць пісаць многія пасля нас. Я проста канстатую факт.

Не хачу абцяжарваць вас падрабязным аналізам літаратурных спраў, ды гэта і не пад сілу аднаму чалавеку. Аб гэтым мае быць вялікая гаворка на нашым пісьменніцкім з'ездзе, які будзе ў гэтым годзе.

Хацелася б сказаць некалькі слоў пра тое, што прынята называць месцам пісьменніка ў грамадскім жыцці. Якімі з'явамі характарызуецца жыццё сучаснага нам грамадства і якая павінна быць пазіцыя пісьменніка як дзеяча культуры ў адносінах да гэтых з'яў?

Кожнаму непрадузятаму чалавеку, па-мойму, ясна, што ў жыцці свету адбываюцца працэсы, якія не дазваляюць сумленнаму пісьменніку або мастаку заставацца ў пазіцыі пабочнага назіральніка. Здавалася б, простая ісціна, але часам даводзіцца пра яе напамінаць. Сучаснае чалавецтва перажывае падзеі, ход якіх ніяк не назавеш плаўным. Працягваецца амерыканская агрэсія ў В'етнаме. Выпрабоўваюцца разбуральныя сродкі страшэннай сілы. Заходнегерманскія мілітарысты і рэваншысты імкнуцца атрымаць гэтую зброю ў свае рукі. Рэакцыйнае буржуазнае мастацтва ўсяляк распальвае ў людзях самыя ганебныя страсці, выступае як злыя сілы са старажытнейшых казак і паданняў народаў усіх краін, стараючыся ператварыць чалавека ў яго процілегласць, пазбавіць яго чалавечага аблічча і чалавечай душы. Розныя сімптомы, але гавораць яны пра з'явы аднаго парадку.

Наша краіна, іншыя краіны сацыялізма сталі ў вачах мільёнаў людзей працы розных нацый, розных палітычных поглядаў, рознага колеру скуры апорай надзеі, апорай веры ў добрую і светлую будучыню. **(Бурныя апладысменты).** Усё, што мы будуем, ствараем, над чым працуюць нашы рабочыя, сяляне, вучоныя, мастакі, на што натхняе нас наша партыя, усё гэта будуецца і ствараецца для міру на зямлі, для перамогі свабоднай працы, у імя ідэалаў дэмакратыі, сацыялізма, братняй дружбы і супрацоўніцтва народаў. Для чалавека. Для чалавецтва.

І сёння з ранейшай актуальнасцю гучыць для мастакоў усяго свету пытанне Максіма Горкага: «З кім вы, майстры культуры?» Пераважная большасць савецкіх пісьменнікаў і прагрэсіўных пісьменнікаў іншых краін ясна адказвае на гэтае пытанне сваімі творамі.

Аб ролі мастака ў грамадскім жыцці мне даводзілася гутарыць з пісьменнікамі, з карэспандэнтамі газет і часопісаў на вялікіх, прадстаўнічых сходах не раз. У прыватнасці, гэта заняло немалое месца ў маёй прамове ў Стакгольмскай ратушы ў час нобелеўскіх урачыстасцей мінулага года. Аўдыторыя там значна адрознівалася ад сённяшняй. **(Ажыўленне ў зале).** І форма выказвання маіх думак была адпаведна некалькі інакшая. Форма! Не змест. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Дзе б, на якой бы мове ні выступалі камуністы, мы гаворым як камуністы. Некаму гэта можа прыйсціся не да спадобы, але з гэтым ужо прывыклі лічыцца. Больш таго, іменна гэта і паважаюць усюды. **(Бурныя апладысменты).** Дзе б ні выступаў савецкі чалавек, ён павінен выступаць як савецкі патрыёт. Месца пісьменніка ў грамадскім жыцці мы, савецкія літаратары, вызначаем як камуністы, як сыны нашай вялікай Радзімы, як грамадзяне краіны, якая будуе камуністычнае грамадства, як выразнікі рэвалюцыйна-гуманістычных поглядаў партыі, народа, савецкага чалавека. **(Бурныя апладысменты).**

Зусім іншая карціна атрымліваецца, калі аб'яўляецца нейкі пісака, які ў нас піша пра адно, а за рубяжом выдае зусім іншае. Карыстаецца ён адной і той жа, рускай мовай, але для таго, каб у адным выпадку замаскіравацца, а ў другім—апаганіць гэтую мову шалёнай злосцю, нянавісцю да ўсяго савецкага, да ўсяго, што нам дарагое, што для нас святое.

Я належу да тых пісьменнікаў, якія, як і ўсе савецкія людзі, ганарацца, што яны малая часцінка народа вялікага і высакароднага. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).** Ганарацца тым, што яны з'яўляюцца сынамі магутнай і цудоўнай Радзімы. Яна стварыла нас, дала нам усё, што магла, бязмерна многа дала. Мы абавязаны ёй усім. Мы называем нашу Савецкую Радзіму маці. Усе мы—члены адной вялізнай сям'і. Як жа можам мы рэагаваць на паводзіны здраднікаў, якія пасягнулі на самае дарагое для нас? З горыччу канстатуе руская народная мудрасць: «У сям'і не без вылюдка». Але ж вылюдкі бываюць розныя. Думаю, што любому зразумела: нічога няма больш кашчуннага і агіднага, чым абылгаць сваю маці, гнюсна зняважыць яе, падняць на яе руку! **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Мне сорамна не за тых, хто абылгаў Радзіму і абліў граззю ўсё самае светлае для нас. Яны амаральныя. Мне сорамна за тых, хто спрабаваў і спрабуе браць іх пад абарону, чым бы гэтая абарона ні матывавалася. **(Працяглыя апладысменты).**

Удвая сорамна за тых, хто прапануе свае паслугі і звяртаецца з просьбай аддаць ім на парукі асуджаных адшчапенцаў. **(Бурныя апладысменты).**

Занадта дарагой цаной дасталося ўсім нам тое, што мы заваявалі, занадта дарагая нам Савецкая ўлада, каб мы дазволілі беспакарана паклёпнічаць на яе і ганьбіць яе. **(Бурныя апладысменты).**

Іншыя, прыкрываючыся словамі аб гуманізме, енчаць аб суровасці прыгавору. Тут я бачу дэлегатаў ад партарганізацый роднай Савецкай Арміі. Што б яны зрабілі, калі б у якім-небудзь з іх падраздзяленняў з'явіліся здраднікі?! Ім жа, нашым воінам, добра вядома, што гуманізм—гэта зусім не слінцяйства. **(Працяглыя апладысменты).**

І яшчэ я думаю аб адным. Папаліся б гэтыя малойчыкі з чорным сумленнем у памятныя дваццатыя гады, калі судзілі, не абапіраючыся на строга размежаваныя артыкулы крымінальнага кодэкса, а «кіруючыся рэвалюцыйнай правасвядомасцю» **(апладысменты)**, ох, не тую меру пакарання атрымалі б гэтыя пярэваратні! **(Апладысменты).** А тут, ці бачыце, яшчэ разважаюць аб «суровасці» прысуду.

Мне хацелася б сказаць і буржуазным абаронцам пасквілянтаў: не турбуйцеся за захаванасць у нас крытыкі. Крытыку мы падтрымліваем і развіваем. Яна востра гучыць і на сённяшнім з'ездзе. Але паклёп—не крытыка, а гразь з лужыны—не фарбы з палітры мастака! **(Працяглыя апладысменты).**

Таварышы! Я дастаткова заняў вашу ўвагу пытаннямі літаратурнага парадку. Не падумайце, што мы, пісьменнікі, жывём толькі справамі літаратуры. Нас хвалюе і многае іншае. Напрыклад, пісьменнік Леанід Ляонаў доўгія гады прысвяціў упартай барацьбе за зберажэнне красы і багацця нашай прыроды—лясоў. **(Апладысменты).** Хвалююць нас і іншыя праблемы. Вось тут пойдзе гаворка аб праблемах зусім іншага парадку. Давайце вырашым праблему Байкала! І дазвольце хоць крыху пагаварыць аб пытаннях нашага планавання.

У «Праўдзе» за 5 сакавіка быў надрукаваны фельетон В. Цітова «Адміністрацыйныя лірыкі». Коратка аб змесце гэтага фельетона. Некалі Міністэрства прамысловасці харчовых тавараў РСФСР вырашыла пабудаваць у горадзе Калязіне гароднінасушыльны завод. Завод пабудавалі. Але сыравінаю ён забяспечаны не мог быць. Вырашылі завод пераабсталяваць для вырабу соусаў з соі. Пераабсталявалі. Але аказалася, што маскоўскі і серпухаўскі заводы ў дастатку забяспечваюць гэтым соусам жыхароў сталіцы і ваколіц. Завод спрабавалі пераабсталяваць на малочны, закупілі дарагое імпартнае абсталяванне, але не паспелі ўстанавіць гэтае абсталяванне, як вырашылі перарабіць завод—пад боенскую апрацоўку птушкі. **(Смех).** Банк адпусціў вялікую пазыку. А ў выніку аказалася, што магутнасць завода ў шмат разоў перавышае наяўнасць і гэтай сыравіны. Завод існуе дзесятак гадоў, на ўсе перапрацоўкі выдаткавана каля мільёна новых рублёў. Магчыма, гэты факт і не такі ўжо вялікі па сваёй значнасці, але дазволена спытаць: якое ж гэта планаванне?

У мінулым годзе ў Волгаградзе ў выніку нядбайнасці, а магчыма, і недагляду ў планаванні і пабудове ахоўнага збудавання выпусцілі ў Волгу з аднаго з заводаў неачышчаныя воды. Загінуўшая рыба плыла на адлегласці 400 кіламетраў ад месца атручвання. Улічана кантрольнымі пастамі: 842 тысячы штук чырвонай рыбы (гэта значыць асятровых), 735 тысяч часцікавай, не ўлічаны загінуўшыя маляўкі, лічынкі і ікра. Па прыблізных падліках, страта, нанесеная народнай гаспадарцы краіны, складае 11 мільёнаў рублёў. Але калі прыняць пад увагу, што добрая палавіна асятровых рыб тоне і не выплывае, дык страты можна па меншай меры падвоіць.

Вернемся да Байкала. Пра яго гаварылася і пісалася шмат. Але ў нас як раз не вельмі іншы раз прыслухоўваюцца да сур'ёзных сігналаў друку. І ці не атрымаецца на Байкале гэтак жа, як і на Волзе? А можа, мы знойдзем у сабе мужнасць і адмовімся ад высечкі лясоў вакол Байкала, ад будаўніцтва там цэлюлозных прадпрыемстваў, а ўзамен іх пабудуем такія, якія не будуць пагражаць пагібеллю скарбніцы рускай прыроды—Байкалу? **(Апладысменты).** Ва ўсякім выпадку трэба прыняць усе неабходныя захады, каб выратаваць Байкал. Баюся, што не даруюць нам нашчадкі, калі мы не зберажом «слаўнае мора, свяшчэнны Байкал»! **(Працяглыя апладысменты).**

Ёсць, таварышы, пытанне асабістага парадку. Прападае Ціхі Дон. **(Апладысменты).** Штогод прамысловыя прадпрыемствы скідваюць у яго, як сцвярджаюць спецыялісты, да 7 мільёнаў кубаметраў сцёчных вод. Азоўскі басейн стаіць перад рэальнай пагрозай поўнага вычарпання рыбных запасаў ужо ў бліжэйшы час. Калі ўловы толькі каштоўных рыб у ім дасягалі раней звыш паўтара мільёнаў цэнтнераў на год, дык у цяперашні час яны не перавышаюць 150 тысяч цэнтнераў, гэта значыць зменшыліся ў дзесяць разоў.

Скідванне сцёчных вод прамысловых прадпрыемстваў, зарэгуляванне вод Дона Цымлянскай плацінай, а тут яшчэ не зусім прадуманае гаспадаранне міністра рыбнай гаспадаркі СССР тав. Ішкова паставілі ўжо Азоўскі басейн на мяжу катастрофы. Пасля доўгага маўчання ў адказ на законныя нападкі «Литературной газеты» і «Комсомольской правды» тав. Ішкоў выступіў з невыразным артыкулам, названым «Азоўскае мора сёння і заўтра». У Азоўскага мора «заўтра» можа не быць, калі тав. Ішкоў будзе гаспадарыць гэтак жа, як і сёння. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).** Гэта з яго ласкі амаль увесь год, за выключэннем двух летніх месяцаў, у моры знаходзіцца каля 200 суднаў, занятых лоўляй бычка і цюлькі. Гэта па яго ўказанню толькі механізаванымі бычковымі драгамі штогод знішчаецца звыш дзесяці мільёнаў малявак судака, гэта значыць зводзіцца на нішто работа ўсіх нераставa-вырастных гаспадарак Азоўскага басейна.

Спасылаючыся на нараду работнікаў навуковых і рыбаздабываючых арганізацый, тав. Ішкоў сцвярджае, што і цяпер можна штогод адлоўліваць па 400—500 тысяч цэнтнераў цюлькі. Але не ўпамінае пра тое, што разам з цюлькай вылоўліваюцца і маляўкі каштоўных рыб.

Прызнацца, учора, 31 сакавіка, хацелася мне выдаць тав. Ішкову па першае чысло, 1 красавіка **(смех, апладысменты)**, але ўвечары сустрэўся з франтавымі сябрамі, з даўнімі таварышамі, і чорт мяне падаткнуў паказаць ім выступленне! Яны абвінавацілі мяне ў грубаватасці, сказалі, што тав. Ішкоў нядрэнны чалавек і работнік, і я даў ім слова змякчыць выступленне. **(Агульны смех, працяглыя апладысменты).** Зразумейце мяне правільна, чаго толькі не зробіш для франтавых сяброў! **(Смех, апладысменты).** Хацелася б мне пакрытыкаваць асятра, гэта значыць міністра. А цюльку—які-небудзь Растоўскі рыбвод—які ж сэнс крытыкаваць? **(Смех, апладысменты).** Гэта вышэй за мае магчымасці. **(Смех).** Даў слова—трымайся, і таму я змаўкаю. Магу толькі ўрачыста ўсклікнуць у адрас тав. Ішкова: «Хай ён жыве і пасецца... на цюльцы!» **(Агульны смех, бурныя апладысменты).**

Павінен сказаць і пра тое, што ўклад нашых вучоных-іхтыёлагаў у навуку вельмі нязначны і вельмі далёкі ад патрэб народнай гаспадаркі. У такіх краінах, як Японія, Румынія і многія іншыя, з аднаго гектара сажалкі бяруць улоў у некалькі разоў большы, чым у нас. Як бачыце, супастаўленне далёка не на нашу карысць, і аб гэтым варта падумаць тым, каму думаць у гэтай галіне належыць. І думаць трэба хутчэй, бо пры імклівым збядненні нашых рэк пытанне аб сажалкавай гаспадарцы стане перад намі ў бліжэйшы час з усёй вастрынёй.

У сваім выступленні я аддаў рыбнаму пытанню не менш увагі, чым літаратуры. Вы думаеце, гэта так сабе? Я за тое, каб у нас было багата рыбы—тарана, рыбца, селядца, а не марской капусты. Няхай марскую капусту есць той, хто хоча. **(Выбух смеху, бурныя апладысменты).** Я стаю за зберажэнне рыбы таму, што ў ёй шмат фосфару. Таксама сцвярджаюць, што фосфар спрыяльна дзейнічае на чалавечы мозг, узмацняе яго дзейнасць. **(Смех, апладысменты).** А гэтая ж штука патрэбна не толькі пісьменнікам! **(Смех, апладысменты).**

Дазвольце яшчэ некалькі слоў пра планаванне. Спашлюся на такі прыклад. Увогуле дык я за планаванне, але і за багацце таксама. Калгасам і саўгасам Растоўскай вобласці не хапае цяпер дзвюх тысяч трактараў. Я за такое планаванне, каб міністр сельскай гаспадаркі тав. Мацкевіч сам прапанаваў гэтыя трактары, каб мы не пасылалі абласных работнікаў здабываць іх усімі праўдамі і няпраўдамі. А што атрымліваецца? Вось нашы абласныя работнікі едуць у Маскву, здабываюць то тое, то другое. Гледзячы на іх, еду і я. **(Апладысменты).** Але ў мяне маштабы, натуральна, меншыя, то школу выклапатаць, то шыферу для калгаснага будаўніцтва дастаць або лесу. І вось прыходжу я да міністра: «Таварыш міністр, дайце, калі ласка, тры тысячы лістоў шыферу для калгасных кароўнікаў і цялятнікаў!» А міністр адказвае: «Ты ж разумееш, што ў нас планавая гаспадарка! Па плану вы ўжо ўсё атрымалі, што вам належыць». Я яму кажу: «Я дык разумею, але каровы, не кажучы ўжо пра цялят, не разумеюць, чаму яны павінны восенню мокнуць пад дажджом, а зімою мерзнуць». **(Апладысменты).** Шыферам накрываюць не дзеля фасону, не дзеля прыгажосці, а з гаспадарчых меркаванняў. Апроч таго, калі накрыць кароўнікі саломаю, дык не будзе стымулу для стараннай нарыхтоўкі кармоў: у выпадку бяскорміцы заўсёды саламяную страху можна стравіць на корм, а шыфер не стравіш... **(Смех, апладысменты).**

І вось, пастаянна гэтак жабруючы, заўважаеш за сабою непрыемныя змены і ў характары, і нават у постаці. **(Смех, апладысменты).** Куды толькі дзяецца ганарлівая пісьменніцкая пастава і былая салдацкая выпраўка! Заўважаеш, што ў цябе і спіна неяк упрашальна сагнута, і ты ўжо звяртаешся да міністра не «таварыш міністр», афіцыйна, а гэтак ліслів: «дарагі Іван Іванавіч!» Паступова папраўкі ў наша планаванне, якія прымушае ўносіць само жыццё, выпрацоўваюць у цябе нейкія драпежніцкія схільнасці. У перапынках нават тут, на з'ездзе, ходзіш па кулуарах і ястрабіным позіркам шукаеш каго-небудзь з міністраў і думаеш: «Што б у яго раздабыць?» **(Смех, апладысменты).** А калі па тэлефоне дамагаешся аўдыенцыі ў міністра, дык гаворыш, што просіць не дэпутат Вярхоўнага Савета, а пісьменнік. Да пісьменнікаў у міністраў больш чулыя адносіны. Словам, усяляк хітрыеш. Так што, як бачыце, пісьменніцкая доля таксама не без выдаткаў.

Прашу прабачэння за тое, што я дазволіў сабе ўсміхнуцца на гэтай высокай трыбуне. Але калі гаварыць сур'ёзна, дык усе мы моцна верым у магутны розум нашай партыі, у ажыццяўленне ўсіх задач, на вырашэнне якіх яна паклікала нас.

І можаце быць упэўнены, дарагія таварышы дэлегаты, што шматтысячны атрад пісьменнікаў, па-сапраўднаму адданых Радзіме і партыі, цалкам падзяляе погляды на мастацтва і літаратуру, выказаныя ў Справаздачным дакладзе нашага Цэнтральнага Камітэта, цалкам падтрымлівае палітыку нашай ленінскай партыі. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

ПРАМОВА ТАВАРЫША Г. М. МАРКАВА

(Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР)

Таварышы! Мы выслухалі з вялікай увагай яркі і глыбокі даклад Леаніда Ільіча Брэжнева аб рабоце Цэнтральнага Камітэта партыі. Усе мы глыбока ўсхваляваны той гіганцкай карцінай, якая разгарнулася перад нашым позіркам. Усе мы перажываем пачуццё гордасці за тую сапраўды тытанічную работу, якую правялі за гэтыя гады Цэнтральны Камітэт, наша партыя, увесь савецкі народ.

Таварышы! У свеце не было другой такой палітычнай партыі, якая падобна нашай ленінскай партыі паставіла б вялікую задачу—арганізаваць асэнсавана, усвядомлена, на навуковых асновах такую складаную галіну духоўнага жыцця грамадства, як літаратура.

Геніяльны эскіз дзейнасці партыі рабочага класа ў гэтым напрамку даў Уладзімір Ільіч Ленін у сваёй гістарычнай рабоце «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура», створанай яшчэ ў перыяд першай рускай рэвалюцыі. З тае пары, як у дасавецкі час, так і ў гады савецкага будаўніцтва, партыя, абапіраючыся на ленінізм, на краевугольныя прынцыпы партыйнай палітыкі ў галіне культуры, аказвала дабратворны, накіроўваючы і арганізоўваючы ўплыў на літаратуру. І партыя стварыла літаратуру, аб якой марыў Ленін, літаратуру, якая складае частку агульнапралетарскай справы! Ленінізм, рэвалюцыя, партыя далі нашай літаратуры самыя рэвалюцыйныя, перадавыя ідэі, і, прыйшоўшы да ўлады, наша партыя стварыла ўсе прадпасылкі і забяспечыла ўсе ўмовы для развіцця сацыялістычнай літаратуры.

У нас поўная свабода слова для кожнага пісьменніка, сэрца якога, творчасць якога аддадзены народу і партыі. Паклёпнікі, ідэалагічныя кантрабандысты, якія прыкрываюць сваю пэцканіну літаратурнай абалонкай, сустракалі і будуць сустракаць гнеў і асуджэнне. Іх лёс — пагарда народа, яго суровы і справядлівы суд. **(Апладысменты).**

Савецкая літаратура ствараецца сёння на шасцідзесяці сямі мовах нацый і народнасцей Савецкага Саюза. Прычым дзесяткі літаратур зарадзіліся і выраслі ў савецкі час.

У савецкім грамадстве існуюць многія доказы дружбы народаў нашай краіны. Яны пануюць ва ўсіх сферах савецкага жыцця: палітыцы, эканоміцы, навуцы. Але я не памылюся, калі скажу, што шматнацыянальная савецкая літаратура — адзін з самых ярчэйшых доказаў непарыўнага адзінства народаў Савецкага Саюза, іх магутнага духоўнага брацтва, іх непахіснай адданасці ідэям ленінскай дружбы народаў.

Сёння, як ніколі раней, плённы і багаты працэс узаемнага ўзбагачэння нашых літаратур, іх сапраўды братняй садружнасці і спаборніцтва. І знамянальна тое, што партыя забяспечыла для мастакоў слова такія ўмовы, пры якіх талент пісьменніка, ідэйна-мастацкія вартасці яго твораў атрымліваюць у краіне найшырэйшы рэзананс, незалежна ад таго, якім народам вылучаны гэтыя пісьменнік.

Савецкая літаратура—равесніца Савецкай улады. Разам з ёю, разам з усім савецкім грамадствам яна прайшла вялікі і слаўны шлях. Яе ўклад у будаўніцтва сацыялізма і камунізма ў нашай краіне агульнавядомы. На лепшых творах савецкай літаратуры выхоўваліся цэлыя пакаленні будаўнікоў нашага грамадства. Прыкметны і адчувальны яе ўклад у сусветную культуру. Мільёны людзей на ўсіх кантынентах зямнога шара бачаць у савецкай літаратуры змагара за мір, дэмакратыю і прагрэс, прадвесніцу камуністычнай будучыні.

За што ж нашы ворагі ненавідзяць савецкую літаратуру? Ды за тое, што гэта літаратура рэвалюцыйная, перадавая, бясконца адданая ідэям Камуністычнай партыі, свайму народу, за тое, што гэта літаратура нясе свету класавую праўду, за тое, што яна кіруецца выпрабаванымі прынцыпамі партыйнасці і народнасці, развіваецца і рухаецца, як літаратура сацыялістычнага рэалізму.

Сацыялістычны рэалізм — вось ён якраз і выклікае асаблівую нянавісць нашых ворагаў. Часам яны нават гатовы прымірыцца з рэалізмам, але прызнаць сацыялістычны рэалізм яны не ў сілах.

У гады, што прайшлі пасля XXII з'езда КПСС, савецкая літаратура ішла наперад. Змагаючыся разам з усёй партыяй і народам за выкананне Праграмы КПСС, літаратура ў цэлым развівалася ў рэчышчы стваральных імкненняў савецкага грамадства. Галоўным прадметам яе мастацкіх даследаванняў заставаліся наш савецкі чалавек, наша сацыялістычнае грамадства з усёй складанасцю праблем, якія яны вырашалі як у галіне ўнутранага жыцця, так і ў галіне знешніх сувязей з чалавецтвам. Сённяшняя літаратура працягвала справу, пачатую першым пакаленнем савецкіх пісьменнікаў. У лепшых яе творах наша сацыяльная рэвалюцыя, наша сацыялістычнае будаўніцтва адлюстроўваліся мужна і праўдзіва, як складанейшы гістарычны працэс руху народных мас, прадыктаваны жалезнымі заканамернасцямі грамадскай барацьбы без замоўчвання вострых вуглоў і драматычных калізій. Бескампрамісна літаратура выкрывала ўсё тое, што перашкаджала нашаму развіццю, умешваючыся ў самыя вострыя і надзённыя пытанні жыцця савецкага грамадства. Не заставалася нязменным у гэтыя гады і яе ўнутранае ўзбраенне: літаратура знаходзілася ў настойлівых пошуках новых, больш дзейсных сродкаў мастацкага выяўлення.

У доказ усяго сказанага можна было б пералічыць дзесяткі і дзесяткі імён пісьменнікаў, назваць сотні твораў, якія ў цэлым, у агульнай сукупнасці вызначылі найбольш істотныя заваёвы савецкай літаратуры апошніх гадоў. Аднак, маючы ў актыве вялікую колькасць добрых, змястоўных кніг, ацэньваючы стан літаратуры як зусім здаровы, нельга не прызнаць з вострым пачуццём жалю, што твораў буйных, маштабных па ідэйна-мастацкім змесце створана ў гэтыя гады менш, чым гэта хацелася б усім нам.

На партыйных канферэнцыях і з'ездах у рэспубліках, якія папярэднічалі XXIII з'езду КПСС, у дакладзе таварыша Брэжнева і выступленнях дэлегатаў з'езда стану літаратуры была ўдзелена вялікая ўвага. Пісьменнікі расцэньваюць гэта як сведчанне ўзрослай ролі літаратуры ў агульнай барацьбе партыі за камунізм. Адначасова мы ў пярэдадзень чарговага з'езда пісьменнікаў СССР абавязаны чула прыслухацца да ўсіх тых крытычных нот, якія прагучалі ў прамовах дэлегатаў. Зусім відавочна, што ўклад літаратуры ў будаўніцтва камунізма павінен быць павялічаны, яе актыўнасць павінна быць узнята яшчэ вышэй. І асабліва неабходна ўзняць яе ідэйна-мастацкія якасці, і не толькі ў агульным і цэлым, а прымяняльна да кожнага асобна ўзятага твора, бо даўно ўжо вядома, што літаратура — вытворчасць паштучная, яна серыйнага патоку не церпіць.

Саюз пісьменнікаў за апошнія гады вырас і колькасна, і па размаху сваіх міжнацыянальных сувязей. Да нас прыйшлі дзесяткі і сотні маладых пісьменнікаў, і сярод іх нямала людзей, па-сапраўднаму здольных, таленавітых, якія прынеслі ў літаратуру свае каштоўныя назіранні з перадавых участкаў камуністычнага будаўніцтва. Гэта нас радуе, бо не перапыняецца сувязь часоў і пакаленняў у літаратуры.

У складаных умовах мірнага суіснавання Савецкай Радзімы з дзяржавамі іншага сацыяльнага ўкладу, у абстаноўцы жорсткага націску на нашы пазіцыі з боку буржуазнай ідэалогіі, ды яшчэ пры вядомай ломцы рада ацэнак і ўяўленняў, што адбываліся ў нас пасля XX з'езда КПСС, ад кожнага пісьменніка, незалежна ад таго, якою колькасцю гадоў вызначаўся яго жыццёвы і літаратурны шлях, патрабавалася велізарная грамадзянская і мастацкая сталасць. Авалоданне ўсёй складанасцю жыцця, усебаковае і глыбокае разуменне ходу сусветнага працэсу, востры сацыяльны зрок да грамадскіх з'яў, чуйнасць да новых рысаў духоўнага аблічча савецкага чалавека—усё гэта давалася мастаку слова не проста, не адразу, ды і не ў аднолькавай ступені. Часам пры самых сумленных намерах пісьменнік не спраўляўся са сваёй задачай.

З'яўляліся ў нас у гэтыя гады і такія творы, у якіх глыбокі мастацкі аналіз сучасных складаных праблем падмяняўся то павярхоўным апісальніцтвам, то аднабаковасцю погляду, то літаратурным манерніччаннем, якое пры больш старанным разглядзе аказвалася не чым іншым, як перайманнем модных узораў буржуазнай літаратуры. Але вынік ва ўсіх выпадках быў адзін і той жа: скажалася агульная карціна нашага жыцця, рэчаіснасць штучна замыкалася мастаком у акалічнасці асобнага, часцей за ўсё вырванага з агульнага патоку факта або падзеі і прыходзіла ў супярэчнасць з праўдай веку, з праўдай нашай эпохі.

Адзін час у літаратуры з'явіўся рад твораў на тэму пра неўладкаванага ў жыццёвым плане, да дзівацкасці недаразвітага ў грамадскіх адносінах маладога чалавека, які сланяўся па вуліцах гарадоў, проста кажучы, бібікі біў і па волі нашых аўтараў строіў з сябе гэткае ўмясцілішча грамадзянскага сумлення. Напэўна, такія маладыя людзі з амбіцыяй і прэтэнзіяй былі ў той ці іншай колькасці. І той ці іншы пісьменнік не паграшыў бы супраць ісціны, калі б ён падверг іх крытыцы і бічаванню, маючы пры гэтым на ўвазе, што асноўная маса савецкай моладзі занята агульнакарыснай прадукцыйнай, часам гераічнай працай і жыццё яе поўнае вялікага зместу і сэнсу. Але, на жаль, такой актыўнай пазіцыі не хапала некаторым пісьменнікам.

Шчыра сказаць, усё гэта сур'ёзна перашкаджала нашай літаратуры ў асэнсаванні сучаснасці, уносіла пэўную блытаніну ў розумы чытачоў і, не будзем утойваць таго, задавальняла нашых ідэалагічных праціўнікаў.

Партыя падтрымлівала і падтрымлівае пісьменнікаў, якія востра бачаць усё тое, што тармозіць наш рух наперад, што перашкаджае нам хутчэй і лепш ажыццяўляць вялікія мэты. Але крытычны пафас сапраўднага савецкага мастака заўсёды бывае стваральным па сэнсу, яго крытыка бывае прадыктавана страсцю змагара.

Цяжкасці і складанасці літаратурнага працэсу зноў і зноў ставяць задачу ідэалагічнага выхавання мастакоў слова як адну з самых першачарговых задач. І тут перш за ўсё гаворка ідзе аб выпрацоўцы марксісцка-ленінскага светапогляду мастака. На жаль, апошні час мы неяк аслабілі барацьбу за стварэнне гэтай рашаючай умовы ў дзейнасці кожнага работніка літаратуры і мастацтва. Не сустракалі ў нашым асяроддзі неабходнага адпору памылковыя разважанні аб тым, што быў бы, маўляў, талент, а ўсё астатняе—веданне жыцця, ідэйная перакананасць, адказнасць перад народам—прыйдзе само, талент пры любых акалічнасцях вывезе. Вядома, талент у мастацтве падобен да зярняці, без якога не вырасце ніякага коласа. Але ідэйнасць мастака, яго партыйны светапогляд, яго трывалыя сувязі з народам—гэта і сонца, і паветра, і вада, без багацця якіх насенне заглухае ў глебе, ледзь толькі выпусціўшы першы парастак, або вырастае кволым і непаўнацэнным. **(Апладысменты).**

Таварышы! Палітыка Камуністычнай партыі, яе ленінская генеральная лінія на ўсіх этапах нашага развіцця былі той сілай, якая натхняла і вяла савецкіх пісьменнікаў. Так было, так ёсць і так будзе заўсёды! **(Апладысменты).** Гады і падзеі, крутыя павароты і цяжкія выпрабаванні, якія выпадалі на долю нашай многанацыянальнай Радзімы, не раз даказалі, што ў савецкіх пісьменнікаў адзін сцяг—сцяг вялікай партыі Леніна і няма ў іх іншых імкненняў, апроч імкнення памагаць партыі ўсімі сіламі душы сваёй. **(Апладысменты).**

І цяпер, у пярэдадзень 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і 100-годдзя з дня нараджэння геніяльнага заснавальніка нашай партыі і дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна, савецкія пісьменнікі, натхнёныя рашэннямі гістарычнага XXIII з'езда КПСС, зробяць усё, каб стварыць новыя творы, натхнёна, праўдзіва ўзнавіць у іх гераічную барацьбу партыі і народа за перамогу ленінскіх ідэй. **(Апладысменты).**

Літаратура і мастацтва 2

Аўторак, 5 красавіка 1966 года.

А. УЛАДЗІМІРАВА

ТЫСЯЧА І АДЗІН КЛОПАТ

НАРЫС

Калі некалькі тыдняў шукаеш чалавека і дамагаешся сустрэчы з ім, а яна ўсё адкладваецца і адкладваецца, калі, нарэшце, заходзіш да яго ў кабінет з пачуццём нейкай радасці—вось, зараз, маўляў, пазнаёмімся, пагаворым, і раптам пачуеш словы:

— Яшчэ адзін карэспандэнт!

Як хочацца ў гэтую хвіліну павярнуць назад! І справа тут не ў журналісцкай канкурэнцыі, не ў тым, што нехта другі паспеў раней, і яму, а не табе будзе належаць адкрыццё яшчэ аднаго цікавага чалавечага характару. (Хаця, калі прызнацца шчыра, і гэта крыху ёсць...) Справа тут у больш істотным. Ці не захвалім мы гэтага чалавека, ці не закружыцца ў яго галава.

Якраз ад гэтага перасцерагаў сакратар райкома партыі, што вельмі беражліва ставіцца да «новай гераіні раёна», на якую сапраўды неяк адразу «накінулася» ўся наша пішучая брація — і з тэлебачання, і з радыё, і з маскоўскіх газет, і з беларускіх часопісаў. Прыкладаў, калі хісталіся ад лаўраў нават моцныя мужчынскія характары, далёка шукаць не трэба. А тут жанчына, усё-такі, як кажуць, «слабы пол».

У такой атмасферы, і радаснай і насцярожанай адначасова, адбылося маё знаёмства з Ганнай Казіміраўнай Вяржбіцкай, дырэктарам Старабарысаўскага саўгаса. Радаснай... Чалавек едзе на з'езд партыі, чалавеку прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы... Насцярожанай... Пэўна, нялёгка і няпроста ёй весці дзелавыя размовы, вадзіць «карэспандэнтаў» па фермах, парніках, палях, падпісваць паперкі, вырашаць адначасова і самыя сур'ёзныя і самыя дробязныя пытанні і ўвесь час адчуваць на сабе неадступны, часам даволі бесцырымонны позірк чужых вачэй: пра што ж ты думаеш, што адчуваеш, ці не прыйшло ўжо да цябе тое кружэнне галавы—спадарожнік поспеху?

Ад Ганны Казіміраўны я не пачула ніводнага слова пра мінулыя здабыткі і поспехі саўгаса, пра свае «ўласныя» заслугі. Дыялог (амаль заўсёды, калі пытанне задавалася ў лоб, і на яго няёмка было не адказваць) адбываўся прыкладна такі:

— Скажыце, а хто надумаў будаваць у саўгасе цэх па апрацоўцы гародніны? Вы?

Хвіліна-другая маўчання, адказ:

— Магчыма.

А далей зноў пра тое, пра што толькі што гаварылася:

— Вось тут мы пабудуем... Вось гэтае балота (у ім—трыста гектараў) асушым... Падвядзём да цяпліц прыродны газ... Парнікі зробім на чатырох гектарах...

Планы, праекты... Здаецца, у саўгаса не было мінулага. Здаецца, ёсць толькі будучае. Адразу цяжка зразумець, а за што ўсё-такі гэтай жанчыне далі «Зорку Героя», за што яна выбрана дэлегатам з'езда. Пэўна ж, не за адны толькі планы... Але калі чалавек у дні такога агульнага прызнання не хваліцца тым, што было ім зроблена, дасягнута, калі ўвесь ён вось так нацэлены ў будучыню і толькі ў будучыню,—не трэба хвалявацца за такога чалавека. Ён не ўчадзее ад славы. Часу не будзе. Будуць зноў звычайныя рабочыя дні. Без карэспандэнтаў і віншаванняў.

Будзе зноў раннім летнім і познім зімовым світаннем («у чатыры гадзіны ўжо на нагах!»—гаворыць шафёр саўгаса), у бездараж, слату і мароз гэтая немаладая ўжо жанчына паспяваць на ферму раней за даярак. На поле—раней за трактарыстаў. У цяпліцы—раней за брыгадзіра. Жоўтая, «дырэктарская» «Волга», што пабачыла нямала на сваім вяку, будзе зноў насіцца з саўгаса ў Барысаў, з Барысава ў Мінск— у трэст, міністэрства, «Сельгастэхніку». Дырэктар будзе гарачыцца, спрачацца, адстайваць свае планы, свае задумы. Будуць клопаты, клопаты, клопаты... Хто можа ўзважыць, колькі іх у дырэктара саўгаса?..

Было гэта даўно. Можа, яшчэ ў той час, калі дачка барысаўскага рабочага Аня Вяржбіцкая рабіла свае першыя

ДОБРА!

Алесь САВІЦКІ

У гэтыя вясеннія дні людзі ўсяе планеты неадрыўна глядзяць на Маскву. Пазыўныя сталіцы нашай Радзімы гучаць з мільёнаў прыёмнікаў на ўсіх кантынентах. Мільёны людскіх сэрцаў стукаюць ва ўнісон з сэрцамі людзей, што сабраліся ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў.

Там, у Палацы, праходзіць з'езд камуністаў нашай краіны. З'езд партыі, якая першым і адзіным сваім клопатам зрабіла пераўтварэнне свету дзеля шчасця і дабрабыту працоўнага чалавека, усталяванне міру і дружбы паміж народамі, духоўны росквіт чалавечай асобы.

Розумам вялікага Леніна быў запалены над Сусветам нязгасны агонь праўды, міру і справядлівасці. І сёння — як заўжды — новы з'езд абвяшчае ўсяму свету, што партыя камуністаў будзе высока трымаць агністы ленінскі сцяг, што яе палітыкай была і застаецца надалей нястомная барацьба за ўмацаванне міру на зямлі, барацьба за мірнае суіснаванне дзяржаў з розным грамадскім ладам, за стварэнне такіх умоў у міжнародным жыцці, пры якіх кожны народ мог бы свабодна развівацца па шляху нацыянальнага і сацыяльнага прагрэсу.

З'езд падагульняе тое, што зроблена ў апошнія гады для нашага савецкага чалавека. А зроблена вельмі і вельмі многа. І лічбы нашых дасягненняў, факты нашых працоўных поспехаў здзіўляюць свет. За апошнія пяць гадоў нацыянальны даход Савецкага Саюза павялічыўся на 33 працэнты і склаў у мінулым годзе звыш 190 мільярдаў рублёў. Амаль тры чвэрці гэтай сумы — 141 мільярд рублёў — выкарыстана на задавальненне патрэб савецкіх людзей. За мінулыя пяць гадоў прырост прамысловай прадукцыі ў тры з лішнім разы перавышае прырост, дасягнуты за ўсе даваенныя пяцігодкі. У мінулым годзе наша краіна выпусціла амаль адну пятую частку ўсёй сусветнай прамысловай прадукцыі...

Дэлегаты з'езда гавораць не толькі аб гэтых выключных поспехах савецкага народа. З такой жа шчырасцю гавораць яны і пра надзённыя праблемы нашага жыцця. Мы не закрываем вочы на тое, што жыллёвае пытанне застаецца найбольш вострым, што адстае будаўніцтва ў гарадах і ў вёсках, што вытворчасць некаторых тавараў адстае ад запатрабаванняў насельніцтва, што далёка не кожнае прадпрыемства, якое выпускае тавары народнага ўжытку, улічвае ўсё ўзрастаючыя запатрабаванні і густы пакупнікоў.

І менавіта гэтым — клопатам пра чалавека — прасякнуты кожны дзень работы партыйнага з'езда. Гаворка пра поспехі прамысловасці, гаворка пра дасягненні працаўнікоў сельскай гаспадаркі, пра тое, што нам трэба яшчэ зрабіць, гаворка пра сённяшні і заўтрашні дзень нашай краіны зыходзіць з гэтай, асноўнай і найгалоўнейшай, запаведзі ў дзейнасці партыі — клопату пра чалавека.

Галоўная задача новага пяцігадовага плана, як сказаў Л. І. Брэжнеў у Справаздачным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС, «складаецца з таго, каб на падставе ўсямернага выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі, індустрыяльнага развіцця ўсёй грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці і прадукцыйнасці працы забяспечыць далейшы значны рост прамысловасці, высокія ўстойлівыя тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі і дзякуючы гэтаму дамагчыся істотнага ўздыму ўзроўню жыцця народа, больш поўнага задавальнення матэрыяльных і культурных патрэб усіх савецкіх людзей».

З'езд гаворыць, што дзеля карысці людзей партыя не пашкадуе сіл, што на чале народа і разам з народам камуністы зробяць усё, каб жыццё савецкіх людзей з году ў год станавілася лепшым, багацейшым, яшчэ больш культурным.

Кожны савецкі чалавек прымае словы з'езда ўсім сэрцам, знаходзіць у яго матэрыялах блізкае яму асабіста. Літаральна кожны савецкі чалавек жыве сёння з'ездам: партыйны кіраўнік і савецкі работнік, настаўнік і ўрач, будаўнік і калгаснік, вучоны і механізатар, даярка і машыніст.

І — вядома ж! — літаратар. У наш, пісьменніцкі, адрас на з'ездзе гаворыцца нямала слоў удзячнасці за добрыя кнігі, што памагаюць людзям працаваць і жыць, змагацца і перамагаць. Гаворыцца і нямала горкіх, але справядлівых слоў. Мала напісана кніг сапраўды таленавітых, сапраўды мастацкіх, сапраўды цікавых і карысных, такіх, якія б сталі вострай і магутнай зброяй у барацьбе за пабудову камунізма.

І, мабыць, кожны літаратар, слухаючы ці чытаючы матэрыялы з'езда, думае над тым, што тычыцца яго, пісьменніцкай, прафесіі.

Імклівы наш час, незвычайнае па глыбіні і шматграннасці наша жыццё! — паспрабуй, паспей за імі. Штодня бачыш шмат новага, таго, што здзіўляе, што ўражвае, захапляе. Садзішся, патроху пішаш. І, бывае, нейкай самай будзённай раніцай раптам даведваешся, што пішаш не пра самае галоўнае, што самае важнае, вялікае і патрэбнае ты не заўважыў, не прыкмеціў.

Зусім нядаўна рэспубліканскія газеты надрукавалі спіс працаўнікоў вёскі, якім былі прысвоены ганаровыя званні Герояў Сацыялістычнай Працы. Я чытаў пра гэта ў тралейбусе — спяшаўся, здаецца, на пасяджэнне ў Саюз пісьменнікаў. Чытаў і радаваўся: колькі новых герояў на Віцебшчыне! Там, дзе, здаецца, усё ведаў вельмі добра, дзе сходжана кожная сцежка, дзе няма калгаса, у якім бы ні пабываў.

Адно прозвішча ў спісе ўзнагароджаных мяне асабліва ўсхвалявала і ўзрадавала. Усхвалявала, бо я добра ведаю гэтага чалавека, ён мой зямляк. А каму не ўсцешна прачытаць добрую навіну пра свайго земляка, ды яшчэ такога, якога і часта сустракаеш і ведаеш, здаецца, няблага. І прыйшла раптам думка: як часта мы сустракаліся з ім, спрачаліся, гаварылі, а я, аказваецца, не заўважаў галоўнага, таго, што было самым істотным у маім земляку. А вось жа людзі заўважылі, адзначылі яго самай высокай узнагародай.

І слушна было б, каб хто папракнуў мяне: маўляў, вось жа ты не напісаў рамана ці нарыса пра гэтага свайго земляка, які з гонарам носіць цяпер Залатую Зорку Героя. А пісьменніцкае вока павінна заўсёды і раней за другіх заўважаць незвычайнае ў самым будзённым і звычайным.

Савецкі мастак — актыўны баец за рэвалюцыйную перабудову свету. Так сказана на партыйным з'ездзе. І для нашай, пісьменніцкай працы, гэта — асноўнае палажэнне. Захапляцца добрым і прыгожым. Ненавідзець усё, што перашкаджае нашаму руху наперад. Ніводнага дня не жыць без радасці, без захаплення, што побач з табою ствараюцца цуды, ніводнага дня без гневу супраць таго, што перашкаджае наступу новага.

Гэта слова нашай партыі, гэта патрэба нашых сэрцаў.

СЯРОД КНІГ

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ. ТОМ ДРУГІ

У выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшаў у свет другі том «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры». Ён ахоплівае перыяд літаратурнага жыцця рэспублікі з 1941 па 1964 год.

Кніга адкрываецца шырокім аглядным артыкулам аб беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

У двух наступных аглядных артыкулах—«Літаратура пасляваеннага перыяду» і «Літаратура на сучасным этапе»—паказваюцца заканамернасці развіцця беларускай літаратуры ад заканчэння Вялікай Айчыннай вайны да нашых дзён, вырашаюцца некаторыя тэарэтычныя пытанні. Тут прасочваюцца асаблівасці развіцця лірыкі, апавядання, аповесці, рамана, паэмы, драматургічных жанраў, даецца ацэнка творчасці найбольш вядомых беларускіх пісьменнікаў; паказваецца роля і месца ў літаратурным працэсе найбольш значных твораў. Многа ўвагі аддаецца творчасці маладых паэтаў і празаікаў, якія прыйшлі ў літаратуру ў апошнія гады. У кнізе ідзе размова аб пашырэнні тэматыкі сучаснай беларускай літаратуры, яе ідэйна-мастацкім росце, новых кірунках, значная ўвага аддаецца так званай ваеннай тэме ў літаратуры.

У дзесяці манаграфічных раздзелах асвятляецца творчасць буйнейшых сучасных майстроў мастацкага слова—М. Лынькова, П. Броўкі, П. Глебкі, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі Асобныя раздзелы прысвечаны творчасці П. Пестрака, Я. Брыля, І. Шамякіна, І. Мележа.

У кнізе зроблена спроба даць шырокі малюнак сённяшняга стану беларускай літаратуры, паказаць яе буйнейшыя поспехі і здабыткі.

У апошнім раздзеле—«Хроніка літаратурнага жыцця», якой адведзена шостая частка кнігі,—даюцца важнейшыя падзеі літаратурнага жыцця рэспублікі, а таксама важнейшыя падзеі грамадскага і культурнага жыцця як Беларусі, так і ўсёй Савецкай краіны.

Кніга выдадзена тыражом у 5.200 экземпляраў.

КУЛЬТУРА РОДНАЙ МОВЫ

Беларуская літаратурная мова сёння — гэта багатая, разгалінаваная сістэма ўстойлівых лексіка - граматычных і стылявых норм, арфаграфічных і арфаэпічных правіл, неабходных для таго, каб мова магла выконваць сваю галоўную функцыю — быць сродкам зносін. Зусім заканамерны працэс паступальнага і няўхільнага павышэння культуры мовы. Актуальнае значэнне ў гэтым складаным працэсе набываюць праблемы далейшай лексічнай і граматычнай нармалізацыі, правільнага словаўжывання, вымаўлення, перакладу, ліквідацыі дублетных форм альбо вузкадыялектычных рыс і г. д.

Беларускія вучоныя—лінгвісты і літаратуразнаўцы—робяць шмат для далейшага ўздыму культуры роднай мовы, для ўпарадкавання яе граматычнай і лексіка-фразеалагічнай сістэмы. Сведчанне гэтаму—чарговае даследаванне, зборнік артыкулаў навуковых супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства АН БССР «Аб некаторых асаблівасцях беларускай літаратурнай мовы». Артыкулы гэтыя прысвечаны некаторым актуальным пытанням культуры нашай літаратурнай мовы: нармалізацыя дублетных склонавых канчаткаў іменных часцін мовы, асаблівасці сучаснага словаўтварэння і калькавання, функцыі новых словаўтваральных сродкаў, сінаніміка некаторых сінтаксічных канструкцый, адхіленні ад норм і правіл літаратурнага вымаўлення, сучасная беларуская пунктуацыя.

Варыянтнасць склонавых форм назоўнікаў і прыметнікаў выклікаецца, як вядома, рознымі прычынамі і строга не рэгламентуецца існуючымі граматыкамі і дапаможнікамі. У артыкулах М. Булахава і А. Наркевіча слушна падкрэсліваецца, што паралелізм разнастайных склонавых канчаткаў у пэўных выпадках апраўдваецца дыферэнцыяцыяй лексіка-стылявога ўжывання слова, асаблівасцямі рытмічнага ладу і сінтаксічнай структуры празаічнай і паэтычнай мовы. На самой справе, правілы напісання канчаткаў назоўнікаў заснаваны на розных фактарах. Гэта і лексічнае значэнне слова (носа, грама, болю, пяску), і характар асновы (крыл, балот, сэрцаў, пажарышчаў), і асаблівасці націску (на стозе, на лузе, на кажуху, на сцягу). Гэтыя агульныя лексічныя, марфалагічныя і акцэнталагічныя адзнакі назоўнікаў нарматыўнай граматыкай падзяляюцца на яшчэ больш дробныя, прыватныя, што ўвогуле стварае даволі складаную і цяжкую для практычнага карыстання сістэму правіл напісання канчаткаў назоўнікаў. Упарадкавання патрабуе перш за ўсё правапіс канчаткаў уласных імёнаў, прозвішчаў і абстрактных назоўнікаў.

Крыху іншы характар мае дублетнасць склонавых канчаткаў прыметнікаў у родным і творным склонах адзіночнага ліку жаночага роду. Карыстаючыся статыстычным метадам даследавання, М. Булахаў глыбока раскрывае прычыны існавання розных канчаткаў, паказвае адносна частае ўжыванне аднаскладовых і двухскладовых форм прыметнікаў. Даследчык сцвярджае, што частата ўжывання кароткіх і поўных форм прыметнікаў абумоўлена не толькі рознымі стылямі пісьмовай мовы, але і «індывідуальнымі асаблівасцямі стылю кожнага пісьменніка, яго адносінамі да праблемы «літаратурнасці» граматычных норм, спецыфікай і глыбінёй моўных сувязей аўтара з народнай мовай у цэлым і яго роднай гаворкай у прыватнасці». З гэтага вынікае настойлівая неабходнасць строгай барацьбы з рознага роду «прыватнымі «анамаліямі», рознымі суб'ектыўнымі лексічнымі і граматычнымі прыўнясеннямі, якія парушаюць цэльнасць і сістэматычнасць граматычнага ладу і лексічнай структуры роднай мовы.

Вельмі надзённая для сённяшняга беларускага мовазнаўства праблема пастаўлена ў артыкуле П. Шубы «Пытанні нормы пры калькаванні». На жаль, у нас яшчэ зусім не вывучаны словаўтваральныя мадэлі і спосабы калькавання рускай лексікі на беларускую. Доўгая пісьмовая практыка беларускіх рэдакцый і выдавецтваў сабрала тут багаты фактычны матэрыял, але ён застаецца здабыткам толькі асобных людзей—перакладчыкаў, рэдактараў, карэктараў. Вось чаму іншы раз на старонках беларускіх выданняў, асабліва газет і навуковых публікацый, можна сустрэць калькі асобных рускіх слоў і ўстойлівых словазлучэнняў, пабудаваныя не па законах беларускай мовы. Для прыкладу можна прывесці хоць бы такія словы і выслоўі: неперавышаны майстар (непревзойденный мастер), пасеяць вясёлкавыя настрої (посеять радужные настроения), самаразгружальны вагон (саморазгружающийся вагон) і г. д.

Такая моўная непісьменнасць павялічваецца ў тых публікацыях, аўтары якіх слаба ведаюць жывую беларускую гаворку, не думаюць самі па-беларуску.

Некалькі артыкулаў зборніка прысвечаны вывучэнню правільнага словаўжывання—адбору з жывой мовы дакладных, трапных слоў. У наш час даволі пашыраныя выпадкі няправільнага ўжывання слоў, якія наглядаюцца амаль ва ўсіх стылях літаратурнай мовы. Няправільнае словаўжыванне—вынік непатрабавальных адносін да жывога слова, няўменне падабраць найбольш адпаведны сінонім, фразеалагізм.

Моўная практыка ставіць перад намі новыя задачы. Узнікае настойлівая неабходнасць у далейшай лексічнай і граматычнай нармалізацыі літаратурнай мовы, у стварэнні поўнага нарматыўнага арфаграфічнага слоўніка, вучэбных дапаможнікаў для газетных работнікаў, студэнтаў, настаўнікаў, вучняў. Патрэбна манаграфічнае вывучэнне найбольш важных і яшчэ нераспрацаваных праблем беларускага мовазнаўства—тэорыі і практыкі перакладу, стылістыкі, пытанняў арфаэпіі і арфаграфіі.

Таму зборнік «Аб некаторых асаблівасцях беларускай літаратурнай мовы» — вельмі патрэбная кніга. Яна прыхільна сустрэта выкладчыкамі і студэнтамі і, бясспрэчна, прынясе карысць усім, хто цікавіцца развіццём роднай мовы і дбае пра яе ўдасканаленне і культуру.

Я. КАМАРОЎСКІ,
выкладчык БДУ імя Ул. І. Леніна.

«Аб некаторых асаблівасцях беларускай літаратурнай мовы». Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск, 1965.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ

Споўнілася 60 гадоў з дня нараджэння доктара філалагічных навук, літаратуразнаўцы Івана Гутарава. Прэзідыум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі накіраваў юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«ДАРАГІ ІВАН ВАСІЛЬЕВІЧ!

Пісьменнікі Савецкай Беларусі горача віншуюць Вас, вядомага літаратуразнаўцу, у дзень Вашага шасцідзесяцігоддзя.

Вы, Іван Васільевіч, прайшлі вялікі жыццёвы і творчы шлях. Выхаванец школы - камуны, якой кіраваў вядомы бальшавік Лепяшынскі. Вы былі ў ліку першых студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, пасля заканчэння якога аддалі шмат сіл навучанню моладзі ў вышэйшых навучальных установах Беларусі. Ад настаўніка Вы выраслі да доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР. Сотні людзей памятаюць Вашы яркія, змястоўныя лекцыі ў Магілёўскім педінстытуце, у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Ул. І. Леніна, у Мінскай Вышэйшай партыйнай школе.

Як літаратуразнаўца Вы ўнеслі значны ўклад у савецкую навуку аб фальклоры. Цікавымі з'яўляюцца Вашы даследаванні ў галіне паэтыкі і тэорыі літаратуры, артыкулы аб рускіх і беларускіх пісьменніках.

Жадаем Вам, дарагі Іван Васільевіч, шмат год жыцця і плённай творчай працы».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага прывітання і ў сваю чаргу жадае юбіляру доўгіх гадоў жыцця і творчых поспехаў.

ТУРБОТЫ МАЛЕНЬКАГА ЧАЛАВЕКА

Аб неабходнасці «оживленного и увлекательного изложения» ў дзіцячым творы гаварыў у свой час В. Бялінскі. Гэтыя ягоныя словы прыгадаліся мне, калі я чытаў кніжку Уладзіміра Юрэвіча «Тараскавы турботы»: аб будзённых клопатах і справах маленькага чалавека пісьменнік гаворыць з задушэўнай цеплынёй і эмацыянальнай прыўзнятасцю.

Усе апавяданні зборніка аб'яднаны адным героем, агульнай думкай. Пісьменнік паказвае малога Тараску ў дачыненні да дарослых, да іх спраў, гаворыць аб тым, як гэты маленькі чалавек працуе, гуляе. Мы бачым, як расце, сталее Тараска. Усё гэта пісьменнік робіць тонка, тактоўна. Вось Тараска мые падлогу («Паслухмяная анучка»), вось думае, дзе пасадзіць выратаванае дрэўца, як дапамагчы ў бядзе дзяўчынцы («Сонейка») — і ў кожным выпадку пісьменнік не забывае неўпрыкмет сцвердзіць нейкую пэўную добрую думку, падкрэсліць важнасць добрых намераў і здзяйсненняў хлопчыка.

Адно з лепшых апавяданняў зборніка, на маю думку, апавяданне «Як спрыт прыйшоў», у якім нітуецца харошая, добрая думка: любая праца можа прынесці карысць, калі рабіць яе з душой, з натхненнем.

Разам з тым, Ул. Юрэвіч не малюе Тараску гэтакім пай-хлопчыкам. Наадварот, Тараска любіць часам і пасваволіць, павалтузіцца з сябрамі, выкінуць які-небудзь «фокус» (апавяданні «Як Тараска сеў у лужыну», «Веласанкі»).

Што яшчэ хочацца сказаць пра гэтую кніжку? Добра, што пісьменнік надае рэчам адухоўленасць, ажыўляе іх — у кнізе, напрыклад, «гавораць» бульдозер, цвічок-ганталік. Гэта абуджае фантазію малых, робіць апавяданне больш жывым, цікавым. Удала выкарыстоўвае аўтар і некаторыя казачныя прыёмы. Напрыклад:

«Тараска злез, знайшоў камень, паклаў цвічок на слупок і пачаў раўнаваць забіяку. Стукнуў раз, прыгаворваючы:

— Гэта табе за калашыну.

Цвічок глуха ўздыхнуў, зашаптаў:

— Не трэба так моцна біцца. Я ж зусім маленькі.

Хлопчык перавярнуў цвічок і стукнуў яшчэ раз:

— А гэта за палец.

— Досыць ужо, — прасіўся ганталік. — Буду служыць табе, як загадаеш, толькі не трэба біцца. Я стану цяпер цвічком-працавічком».

Удаліся аўтару і вобразы некаторых дарослых. Гэта ў першую чаргу вясёлы, смяшлівы механік (бацька Тараскі), ваяўнічы, праслаўлены ваяка Ахрэм, які любіць расказваць дзецям пра свае ваенныя прыгоды, увішная бабка Тараскі.

Ёсць у кнізе і недахопы. Сям-там празаік збіваецца на шаблон. Напрыклад, апавяданне «Тараскава здабыча» напамінае шматлікія творы, дзе хлопчыку з горада, які прыехаў у вёску, на рыбалцы альбо не шанцуе зусім, альбо, наадварот, трапляецца вельмі добрая здабыча — на зайздрасць вясковым хлопчыкам.

Варыяцыі даўніх і вядомых сітуацый знаходзім і ў апавяданнях «Вільчык падвёў» і «Не раскрыўся». Няўдалыя парашутныя трукі, прызямленне ў крапіву — усё гэта мы сустракалі ў многіх творах для дзяцей.

Гумар — добрая якасць дзіцячай кніжкі, але навошта паўтараць бачанае, чутае? У апавяданні «Чорная пляма» бацька Тараскі наўмысна не можа здагадацца, хто нарабіў бяды ў яго кабінеце, у той час, калі чытачу ўсё зразумела.

Усё ж, нягледзячы на гэтыя недахопы, хочацца падкрэсліць, што Ул. Юрэвіч намаляваў праўдзівы дзіцячы характар, які сцвярджае сябе праз свае маленькія адкрыцці і свае штодзённыя справы.

Б. ЗУБКОЎСКІ.

Ул. Юрэвіч. «Тараскавы турботы». Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1966.

Беларускія пісьменнікі—частыя госці студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Нядаўна ва універсітэце пабывалі Максім Лужанін, Кастусь Кірэенка, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Алег Лойка. Яны пазнаёмілі студэнтаў са сваімі новымі творамі. Свае вершы чыталі і студэнты Р. Семашкевіч, Ю. Голуб, М. Дукса, Ул. Дзюба, М. Губернатараў, С. Законнікаў.
На здымку—Максім Лужанін сярод студэнтаў.

Фота С. СУПРУНА.

ПОПЛЕЧ

«Вільнюскае падполле». Так называецца зборнік успамінаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Вільнюскім краі ў 1920—39 гадах. Удзельнікі падполля Ф. Пірышка, Ю. Кавальскі, М. Міхайлоўскі, М. Танк, А. Сцефановіч, С. Прытыцкі і іншыя расказваюць пра поўнае трывог і небяспекі жыццё і работу камуністаў Заходняй Беларусі, пра тое, як кіравалі яны рэвалюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам.

«Вільнюс! Хоць ні ў адным горадзе я столькі не галадаў, не правёў столькі трывожных, беспрытульных начэй, менавіта Вільнюс стаў для мяне назаўсёды блізкім і дарагім. Бо тут былі запоўнены першыя старонкі сяброўства і кахання, у гэтым горадзе былі створаны першыя мае песні, тут мае шляхі скрыжаваліся з шляхам таварышаў па працы, па сумеснай барацьбе за лепшую будучыню»,— так пачынае свае ўспаміны Максім Танк. Паэт расказвае пра падпольныя і іншыя выданні, у якіх друкавалі свае творы беларускія пісьменнікі-рэвалюцыянеры, пра літоўска-беларускія літаратурныя сувязі і г. д.

Многія з аўтараў пішуць пра мужнасць і непахіснасць камуністаў і камсамольцаў у час допытаў і катаванняў у засценках дэфензівы, пра барацьбу КПЗБ з правакатарамі.

Кожнаму, хто прачытае зборнік, надоўга запомніцца расказ С. Прытыцкага, які мужна выканаў прысуд партыі правакатару і не схіліў галаву перад ворагам нават пад пагрозай смяротнай кары.

Чытач знойдзе ў кнізе і іншыя цікавыя матэрыялы пра барацьбу шматнацыянальнага вільнюскага пралетарыяту, прагрэсіўнай інтэлігенцыі.

Зборнік «Вільнюскае падполле» — важная крыніца для вывучэння літоўска-беларускіх рэвалюцыйных сувязей.

Ш. КУРЛЯНДШКАС.

З НАШАЙ ПОШТЫ

БРАТЫ-КІНАМЕХАНІКІ

Пра братоў Мікулевічаў у Пяршайскім сельсавеце гавораць з павагай. Абодва яны кінамеханікі. Старэйшы, Зігмунд, працуе на стацыянарнай устаноўцы ў Пяршайскім Доме культуры. Кожны тыдзень ён дэманструе па пяць кінафільмаў для дарослых і па два—для дзяцей.

Малодшы брат Раман ездзіць з кінаперасоўкай. Ён абслугоўвае вёскі Мішаны, Скрундзеўшчыну, Папкі, Семярнікі, Канюшаўшчыну. Пяцьшэсць разоў на месяц бывае кінамеханік у кожным з гэтых населеных пунктаў.

П. БАРОДКА.

ЧЫТАЧЫ І КНІГІ Ў КРЫЎДЗЕ

У адным з дамоў па вуліцы Чайкоўскага размясцілася масавая бібліятэка № 13. Яна мае багаты кніжны фонд—звыш 45 тысяч тамоў літаратуры.

На жаль, карыстацца гэтым скарбам чытачы не маюць магчымасці. Памяшканне бібліятэкі вельмі цеснае. Кнігам не хапае месца на стэлажах, яны на падлозе, пад сталамі, за грубкай, на вокнах—усюды, дзе ёсць свабодны куточак. Цяжка знайсці ў такім вэрхале патрэбную чытачу кнігу. Многа каштоўных кніг псуецца.

Бібліятэка не мае чытальнай залы. Няма дзе пачытаць свежы нумар газеты, часопіса. Наша бібліятэка абслугоўвае дарослых чытачоў і дзяцей, і ўсе яны незадаволены: нельга правесці ніводнага масавага мерапрыемства. Гэта, як відаць, адзіная ў Мінску бібліятэка, якой даводзіцца працаваць у такіх умовах.

Мы просім Упраўленне культуры Мінскага гарвыканкома прадаставіць нашай бібліятэцы больш зручнае памяшканне, дзе можна было б і кніжны фонд упарадкаваць і разгарнуць як след работу сярод чытачоў.

Л. СІДОРЫК, старшыня савета бібліятэкі № 13, Ул. ІНАЗЕМЦАЎ, С. КРУЧОНАК, Н. КАЛЯДА, В. ПАЎЛОЎСКАЯ, С. ПАТАЛЕЙ, Н. ШЭНДЗЕРАВА — чытачы.

ДАВЕР'Е АБАВЯЗВАЕ

Ідзе гістарычны XXIII з'езд нашай партыі. Ці трэба казаць, што сёння — гэта самая галоўная падзея ў жыцці мільёнаў і мільёнаў людзей як у нашай краіне, так і за рубяжом. Радуе і хвалюе, што на з'ездзе надаецца вялікая ўвага пытанням літаратуры і мастацтва. Камуністычная партыя, гаворыць таварыш Л. І. Брэжнеў, заўсёды высока цаніла ролю творчай інтэлігенцыі — дзеячоў літаратуры і мастацтва.

У гэтыя дні яшчэ мацней адчуваеш сваю вялікую грамадзянскую адказнасць перад народам, перад партыяй. Зноў і зноў дзеячы мастацтва задаюць сабе пытанне: ці ўсё мы зрабілі, каб быць вартымі велічных задач, якія паставіла партыя?

Так, многае зроблена. І ўсё-такі многае, вельмі многае трэба яшчэ зрабіць. Хочацца, каб ва ўсіх нашых творчых установах была створана атмасфера найвялікшай патрабавальнасці і прынцыповасці, высокай грамадзянскай адказнасці мастака перад народам. Гэтаму нас вучыла і вучыць партыя. Узор гэтай адказнасці мы бачым на яе XXIII з'ездзе.

А. КЛІМАВА,
народная артыстка БССР.

крокі — «пехатой пад стол». У былы панскі маёнтак пад Старобінам прыехаў дырэктар. Першы ў гэтых мясцінах савецкі дырэктар. Прыехаў на змену былому панскаму аканому, які ўсё яшчэ выконваў тут абавязкі кіраўніка гаспадаркі. Выпісаны некалі панам спецыяльна з Латвіі, гэты аканом быў культурным гаспадаром-земляробам. Ажыццявіў складаную ірыгацыйную сістэму, строга прытрымліваўся севазваротаў. Багацейшыя ўраджаі давалі травы на панскіх залічных лугах. У гаспадарцы трымалі толькі пародзістых статак... У белым капелюшы, старанна адпрасаваным касцюме вадзіў ён «бальшавіка-галадранца» па гаспадарцы і між іншым «прарочыў»:

— Вы, бальшавікі, ніколі не станеце культурнымі гаспадарамі. Зямля любіць розум, вытрымку. А вы хочаце ўзяць ад яе ўсё адразу.

Памяць, як і жыццё, мае свае законы. Некалі ў дзяцінстве чула я пра гэтага аканома «ў белым капелюшы», а чамусьці запомніліся яго гэтыя словы. І тут, у Старабарысаўскім саўгасе, усплылі ў памяці неспадзявана і настойліва.

Культурны гаспадар. Зямля і розум. Які ж гаспадар яна, аграном-дырэктар Ганна Казіміраўна Вяржбіцкая?

Калі пра агранома гавораць, што ён любіць зямлю, гэта не толькі літаратурны штамп. Гэта, па-мойму, і няпраўда. Для агранома зямля — не паэтычнае панянце.

Зямля—гэта глеба. Лепшая ці горшая. Меншай затраты чалавечай працы ці большай патрабуе яна. Кожны новы дзень — новы клопат. А колькі нясе гаспадарчы год! Як з насеннем? Ці перазімуюць азімыя? Што будзем сеяць на гэтым участку, што на тым?.. Усё трэба ведаць, узважыць, прадумаць, каб ніякія сюрпрызы прыроды не былі нечаканымі. Культура земляробства для кожнай глебы, для кожнага палетка свая. Яна не нараджаецца ні ад дырэктыў, ні ад загадаў. Яна ад сапраўднай (не паэтычнай!) любві да зямлі. А таксама ад ведаў і вопыту. І ад характару чалавека.

— На нашых землях канюшына добрая расце,—гаворыць Ганна Казіміраўна. — Кармавая база на ёй трымаецца.

— А што рабілі тады, калі за травасеянне білі, ды так, што...

—Апушчу, бывала, вочы, маўчу. Ну няхай сабе «траваполышчыца», няхай!.. Затое...

А «затое» магло і не прыйсці. Надвор'е падвяло б, ці што-небудзь яшчэ здарылася. І цяпер не вадзіла б мяне Ганна Казіміраўна з такой гордасцю па ферме—тут ужо цяжка захаваць раўнадушны выраз на твары,—не паказвала б адну за адной гэтых сытых, пародзістых чорна-пярэстых кароў, не гаварыла б:

— Прыгажуня, га? А гэтая? А вось гэтая, паглядзіце...

Быў дакладны агранамічны разлік. Была старанна апрацавана і ўгноена глеба. І была падтрымка. І ў райкоме, і ў абкоме партыі былі людзі, якія бачылі поспех саўгаса, разумелі дырэктара-агранома і не надта спяшаліся прышываць ёй, Вяржбіцкай, за канюшыну, за гэты вельмі добры корм у зялёным канвееры, ярлык «траваполышчыцы».

Старабарысаўскі саўгас даў дзяржаве сёлета дзесяткі тысяч рублёў прыбытку. У два разы больш запланаванага паслалі адсюль гараджанам малака... Гародніну, у тым ліку раннюю (парнікі—гэта ж таксама культура земляробства), Барысаў атрымлівае бесперабойна, больш, чым мог рэалізаваць. Таму і нарадзілася гэтая разумная, гаспадарлівая ідэя пабудаваць у саўгасе свой цэх па апрацоўцы гародніны. І вось за гэта, за працу сваю і працу агранома Валянціна Фёдаравіча Левічава, даяркі Праскоўі Максімаўны Якубоўскай, трактарыста Мікалая Дубені, рабочай цяпліцы Ніны Дайнека і многіх, многіх іншых—за гэта «Зорка Героя» дырэктару і пашана ўсяму калектыву саўгаса. І за культуру земляробства. І за гаспадарчы размах...

— Больш за ўсё я баялася будаваць, калі прызначылі мяне сюды...

— І таму так многа будавалі?

— Магчыма...

Зноў стрыманы адказ і маўчанне. Але я ведаю ўжо, што стаіць за гэтай стрыманасцю. Вучылася («ох, як было цяжка, з матэматыкай яшчэ на школьнай парце не паладзіла») разбірацца ў чарцяжах, каб гаварыць «на роўных» з прарабамі і інжынерамі-будаўнікамі. Сядзела вечарамі над праектамі. Кожную бэльку сваімі рукамі перамацала, кожную цаглінку агледзела. Баялася будаваць... Так проста, так па-жаночаму гэта было сказана. І так паважна цяпер уздымаюцца на сядзібе саўгаса новыя катэджы для рабочых і служачых, новы клуб і кантора, новыя парнікі.

І яшчэ праекты, планы, мары...

...Пяць гадоў «дырэктарствуе» ў саўгасе Ганна Казіміраўна Вяржбіцкая. Пяць гадоў сее. будуе. Будуе і сее... Як склалася яе жыццё дагэтуль? Да вайны скончыла плодагароднінны інстытут імя Мічурына, пасля вайны пачынала старшынёй калгаса. А потым усё пайшло, як у дрэннай кінастужцы—пасада за пасадай: то аграном раёна, то ў інспекцыі, то ў насеннай канторы, то ў сельгасупраўленні. Словам, доўгі час была «беззямельным» аграномам, можа і патрэбным, але ўсё ж канцылярскім работнікам.

Я гляджу ў акно, на палеткі, на ўздыбленую паводкай Бярэзіну, на тыя ўчасткі, пра якія Вяржбіцкая гаварыла:

— Асушым іх, правядзём канал. Цёплай вадою будзем паліваць парнікі, агароды. Якое багацце можна тут атрымаць!

І думаю пра яе—жанчыну з заклапочаным тварам і строгай прычоскай, пра яе звычайнае жыццё. Будуць і далей у ім рабочыя дні. І будзе наступленне. На зямлю. На балоты. На раўнадушных. І на ўласную стомленасць. Відаць, будуць і памылкі і расчараванні. І гнеў і радасць. Не будзе толькі абыякавасці на твары, не будзе акуратнасці ў пісьмовых справах. «У мяне ніколі не бывае парадку на пісьмовым стале»,—будзе скардзіцца яна некаму, як скардзілася мне. Будзе вырашаць свае праблемы: «Лічу, што пародзісты маладняк нельга здаваць на мясакамбінат, гэта больш, чым неразумна!»: «Міністэрства меліярацыі не павінна лічыцца з выдаткамі, калі трэба асушыць балота. У сто разоў акупяцца яны за некалькі гадоў»; «Лічу, што...»

Іх многа, пытанняў і праблем, якія ставіць жыццё перад сельскай гаспадаркай. І добра, што нараджаюцца яны практыкай і розумам людзей, якіх (памыліўся ўсё ж стары пан аканом!) можна назваць высока культурнымі гаспадарамі зямлі.

...Начальнік аддзела кадраў саўгаса, у нядаўнім міліцэйскі работнік, працягнуў Ганне Казіміраўне паперку. Нечую заяву.

— Просіцца на работу. Як сабе хочаце, а браць нельга...

Некалі з групай блазнюкоў гэты чалавек залез ноччу ў мясцовы магазін. Цяпер адбыў свой «тэрмін», ажаніўся і просіцца на работу ў саўгас.

Маўчыць дырэктар. Задумалася... Не прыняць—будзе бадзяцца без справы. Можа пачаць піць. Хто ведае, куды яго пацягне? Жонка маладая такая, харошая... І—на паперку кладзецца рэзалюцыя.

Пацiснуўшы плячыма, выйшаў з кабінета начальнік аддзела кадраў. Не забыўся папярэдзіць:

— Адказваць буду не я.

І зноў мы з Ганнай Казіміраўнай ходзім па фермах, па цяпліцах. У адной з іх нам сустрэлася маладая, светлавалосая жанчына. Спакойная, вясёлая. Тая, мужа якой усяго пяць мінут назад дырэктар саўгаса вырашыла ўзяць на работу.

...За што атрымала «Зорку Героя» Ганна Казіміраўна Вяржбіцкая? За высокія ўраджаі, высокія надоі? Так.

Але, пэўна, і за чалавечнасць таксама.

ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА У РАСІІ

ГАСЦЕЙ ПРЫМАЕ УРАЛ

Вуліцы Свярдлоўска лашчыць пяшчотнае сонейка. Тэмпература вышэйшая за дзесяць градусаў. Словы «вы прывезлі з сабой вясну», якія часта гаварылі на канцэртах нашым артыстам, цяпер носяць не толькі фігуральны характар. На жаль, ахвярамі вясны аказаліся самі яе вястуны. Мы ўсе ў зімовым адзенні (ехалі ж у Сібір!), але вясна на Урале выдалася ранняя і цёплая.

Нязручнасці ад змены кліматычных зон (фестывальны поезд перасек іх некалькі) цалкам акупляюцца сардэчнасцю прыёму.

У гасціннасці ўральцаў мы пераканаліся далёка ад Свярдлоўска, калі наш поезд нечакана быў абуджаны гукамі музыкі.

Маленькая станцыя, незапланаваны прыпынак. Каго ж тут сустракаюць? Аказалася, поезд увайшоў у межы Свярдлоўскай вобласці, і гэта сустракаюць нас чыгуначнікі і чыгуначніцы, школьнікі і школьніцы, аркестр, які прыбыў за дваццаць кіламетраў з раённага цэнтра. Усю дарогу далей паўтаралася тая ж карціна—святочныя натоўпы людзей, транспаранты, музыка. У Свярдлоўску праз шэрагі сустракаючых упарта прабівалася жанчына «У мяне сёння свята, я беларуска...» — паўтарала яна, і людзі сaступалі ёй дарогу. Свята ў горадзе пачалося ў той самы момант, калі наш поезд падышоў да перона. У гонар беларускіх гасцей у неба ўзняліся ракеты. А раней Тамары Ніжнікавай і Нінэль Ткачэнка паднеслі хлеб-соль, і сакратар Свярдлоўскага абкома КПСС В. Гудкоў, старшыня гарсавета А. Пушкароў, пракатчык Верх-Ісецкага металургічнага завода Герой Сацыялістычнай Працы Н. Чарныш, народная артыстка РСФСР В. Нясцягіна прачула віталі пасланцоў беларускага мастацтва.

Па-свойму павіншавалі ўдзельнікаў фестывалю артысты Свярдлоўскага тэатра музычнай камедыі. Перад пачаткам спектакля «Чорны дракон», які быў паказаны спецыяльна для гасцей, артысты балета ў беларускіх фартушках вынеслі на сцэну вялізную бульбіну. У рытме «Бульбы» быў выканаты віншавальны маналог, а потым муляж павярнулі, і з-за яго паднялася дзяўчына-уралачка з гронкай рабіны...

«Уральская рабінушка» і беларуская «Чырвоная каліна» маглі б стаць пазыўнымі ўсёй нашай трынаццацідзённай праграмы на Урале. Яна адкрылася святочным паказам у Палацы культуры праслаўленага Уральскага завода цяжкага машынабудавання. Удзельнікам гэтага паказу свярдлаўчане паднеслі цюльпаны, па якія спецыяльна пасылалі на поўдзень самалёт.

Удзячныя госці адказалі канцэртам, які працягваўся некалькі гадзін.

Атмасферай дружбы і выключнай сардэчнасці прасякнуты ўсе выступленні нашых артыстаў. Канцэрты адначасова праходзяць у Свярдлоўску, Ніжнім Тагіле, Каменску-Уральскім, Краснатур'інску, Сярове, Рэўдзе, Дзягцярску, Асбесце і іншых гарадах.

Ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылася ў Свярдлоўску 2 красавіка выстаўка беларускага выяўленчага мастацтва. 6 красавіка ўральскія і беларускія мастакі едуць да пагранічнага абеліска «Еўропа—Азія» на эцюды.

Ва ўсіх гарадах і раённых цэнтрах Свярдлоўскай вобласці ідзе фестываль беларускіх фільмаў.

Аўдыторыю фестывалю не можа змясціць ніводная канцэртная зала. У дзень прыезду мы спаткалі ў горадзе дыктараў Беларускага тэлебачання Зінаіду Бандарэнка і Леаніда Ларуціна, рэжысёра Віктара Карпілава і галоўнага рэдактара палітвяшчання Тамару Якута. За тры дні да пачатку фестывалю яны перадалі ў эфір дзесяцігадзінную праграму тэлебачання і дванаццацігадзінную радыёпраграму, прысвечаныя Беларусі.

Свярдлоўскі час толькі на дзве гадзіны адрозніваецца ад нашага. Пісьмо, адпраўленае сёння ў Мінску, паслязаўтра самалётам будзе даастаўлена ў Свярдлоўск.

А дружба не ведае адлегласцей. У гарах Урала ходзяць магутныя «МАЗ'ы», яны вельмі добра «ўпісваюцца» ў мясцовы пейзаж. Рэчыцкія нафтавікі бураць шчыліны з дапамогай абсталявання, якое зроблена на Урале. На Урале нямала людзей, якія вызвалялі беларускую зямлю, дапамагалі яе адраджаць. Беларусь блізкая і дарагая сэрцу уральцаў і пра гэта гаворыць новая песня, якую напісаў да фестывалю кампазітар Яўген Радыгін:

Пусть горит, не угасая,
Над тобою свет Кремля,
Легендарная, святая
Белорусская земля!

М. МАРЦІНКОЎСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

МАРШРУТАМ БРАТЭРСТВА

ДРУЖБА— НАША СІЛА, НАША РАДАСЦЬ

Я самы стары ўдзельнік Фестывалю беларускага мастацтва ў Расіі і вазьму на сябе смеласць гаварыць ад імя ўсіх яго ўдзельнікаў. Мы перажываем хвалюючыя дні. З сэрца ў сэрца перадаецца цеплыня нашай дружбы, і гэтую радасць узаемных сустрэч ні з чым не параўнаць.

З першага дня фестываль перарос рамкі культурнай падзеі і ператварыўся ў буйную з'яву грамадска-палітычнага жыцця.

Мы пяем славу Расіі, і трэба бачыць, як адгукаюцца на словы любві ўдзячныя сэрцы нашых слухачоў.

Толькі з падарункаў, паднесеных Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэле БССР, можна было б стварыць цэлы музей.

У цяжкія дні вайны мне давялося пераканацца, што такое гасціннасць сібіракоў і ўральцаў, гэта не забываецца. Што ж гаварыць пра сённяшнія нашы гастролі, калі мы прыехалі ў квітнеючы край, ператвораны працавітымі рукамі ў казачную зямлю.

Па шмат разоў просяць нас спяваць нашы песні, прысылаюць запіскі, часта на беларускай мове, заходзяць за кулісы, каб узяць ноты. У беларускага мастацтва з'явіліся мільёны новых прыхільнікаў і шчырых сяброў.

Я прывяду толькі адно пісьмо, атрыманае ў дні фестывалю:

«Дазвольце мне, былому франтавіку, вітаць беларускі фестываль на нашай сібірскай зямлі. Вы зрабілі нам шмат прыемнага, паказалі непаўторную праграму.

Мне ўдвая прыемна сустрэцца з беларусамі, бо ў жніўні 1944 года наша часць стаяла ў Беларусі, і мы займаліся будаўніцтвам дарог і мастоў, пачынаючы ад самага Брэста. Пабудавалі мост праз Свіслач у Мінску каля электрастанцыі, мост у Віцебску і іншыя. За ўдзел у гэтых работах я атрымаў узнагароду — гадзіннік. Захоўваю яго як вельмі дарагі ўспамін.

Прыміце яшчэ раз падзяку ад усёй душы за ваша цудоўнае мастацтва. Да майго пісьма далучаюцца ўсе члены сям'і. Шчаслівай вам дарогі! Яшын Георгій Іванавіч, маёр у адстаўцы, член КПСС з 1920 года, Омск, вул. Маякоўскага, 19, кв. 1».

Я прывёў адно толькі пісьмо. А колькі іх паступіла ў наш адрас, у адрас усіх творчых калектываў і салістаў!

Мы з радасцю раскрываем рускім братам скарбніцу нашага народнага мастацтва і, у сваю чаргу, шмат чаго бяром ад іх. Пасля фестывалю Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР уключыць у свой рэпертуар новыя творы сібірскіх і ўральскіх кампазітараў. Галоўным нашым здабыткам стане дружба, яшчэ больш моцная, чым раней, тая жыватворная дружба, без якой цяжка ўявіць сабе сёння нашу краіну Саветаў.

Р. ШЫРМА,
народны артыст СССР.

СУСТРЭЧА СА СТАРЫМ СЯБРАМ

У мяне былі тры фестывальныя сустрэчы з Ігарам Сарокіным. Першы раз я ўбачыў яго на вакзале, калі фестывальны поезд толькі падышоў да перона. Святочны натоўп кінуўся да вагонаў, Ігара Дзмітрыевіча адразу некуды аднесла, і мы ледзь паспелі памахаць адзін аднаму рукой.

У наступны дзень, прыйшоўшы ў тэатр, я пачуў знаёмы голас. Гучала вельмі самабытная музыка. Не ўтрымаўшыся, я штурхнуў дзверы ў клас. Так адбылася мая другая сустрэча з Ігарам Сарокіным і яго акампаніятарам Верай Багатырскай, маімі таварышамі па рабоце ў Новасібірскім тэатры оперы і балета ў 1960—62 гадах.

— Зацікавіўшыся музыкай, я спытаў Ігара Дзмітрыевіча, што ён выконвае. Замест адказу ён заспяваў яшчэ.

Гэта аказаліся рамансы Эдзі Тырманд на словы Максіма Танка. Вершы ўразілі мяне сваёй філасофскай глыбінёй. Ігар Дзмітрыевіч на некалькі хвілін спыніў рэпетыцыю, і я падумаў, што ён, як быў, так і застаўся нястомным працаўніком, якога і святочныя сустрэчы, і цяжкасці гастрольных маршрутаў не могуць выбіць з раз назаўсёды ўстаноўленага рэжыму.

У трэці раз я сустрэўся з Ігарам Сарокіным увечары на нашай сцэне, той самай сцэне, на якой ён шэсць гадоў назад рэпеціраваў партыю Рыгалета.

Ігар Сарокін і тады, будучы яшчэ зусім маладым чалавекам, уразіў нас сваёй сур'ёзнасцю, дакладнай вызначанасцю творчых пазіцый.

Мы працавалі з ім над шэрагам оперных роляў, і для кожнай ён знаходзіў асобнае рашэнне, свае фарбы. Артыст не проста браў ад рэжысёра задачу, ён прыходзіў са сваімі прапановамі, шукаў сваю трактоўку. Такое супрацоўніцтва прыносіла радасць, бо было ўзаемнае і багатае на знаходкі.

Майстэрства І. Сарокіна грунтуецца на рэдкай і вельмі каштоўнай для опернага спевака якасці: стараннай вакальнай распрацоўцы партыі і беззакорным веданні не толькі свайго, але і чужога музычнага матэрыялу, усяго аркестравага гучання твора.

Ствараючы вобраз вакальнымі сродкамі, артыст вельмі ўзбагачае яго сцэнічна. І. Сарокін мае выдатную дыкцыю, удзячную сцэнічную знешнасць, ён быццам народжаны для опернай сцэны. Але мастацкі дыяпазон спевака значна шырэйшы. Ігар Дзмітрыевіч праявіў сябе як камерны спявак, а на канцэртах фестывалю я ўпершыню пачуў яго і як выканаўцу публіцыстычнай масавай песні. Дзякуючы І. Сарокіну мы пазнаёміліся з такімі цікавымі творамі беларускіх кампазітараў, як «Абеліск» Д. Смольскага, «Камсамольская песня» І. Лучанка, «Балада-ўспамін» Я. Грышмана. Грамадзянскі пафас гэтых твораў як нельга больш адпавядае таленту выканаўцы.

Параўноўваючы Ігара Сарокіна — таго, якім я ведаў яго ў Новасібірскім тэатры оперы і балета, і таго, якім убачыў зараз, на фестывалі,—я мушу адзначыць, што артыст значна вырас. Павысілася яго вакальнае майстэрства, багацейшая стала нюансіроўка, больш разнабаковае — валоданне рэгістрамі голасу. Раней былі выпадкі, калі малады тэмперамент, гарачнасць і сіла голасу падмянялі ў Сарокіна тонкасць музычнай трактоўкі. Цяпер выканаўчую манеру артыста можна цалкам лічыць сталай. Гэта яскрава пацвердзіла выступленне Ігара Сарокіна на фестывалі ў спектаклі нашага тэатра «Рыгалета».

Наперадзе ў народнага артыста Беларусі яшчэ шмат актыўных творчых гадоў. Я гутарыў з Ігарам Сарокіным і пераканаўся, што ён мае смелыя планы.

Адна з найбольш цікавых задум артыста — вобраз Барыса Гадунова. Гэта даўняя мара спевака. Мы гаварылі аб ёй яшчэ, калі Ігар Сарокін працаваў у Новасібірску. Творчай натуры Ігара Сарокіна вельмі адпавядае гэты глыбока трагедыйны вобраз, які з'яўляецца вяршыняй сусветнай опернай драматургіі. Я буду вельмі рады, калі Ігару Дзмітрыевічу ўдасца ажыццявіць свой намер, і гатовы спрыяць гэтаму ўсімі сіламі.

Хочацца пажадаць майму добраму сябру далейшых поспехаў у рабоце на беларускай опернай сцэне, мэтанакіраванасці і настойлівасці — якасцей, без якіх нельга ўявіць сабе творчы шлях таленавітага спевака.

Э. ПАСЫНКАЎ,
галоўны рэжысёр Новасібірскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета.

ЖЫВЫ СТРУМЕНЬ СУЧАСНАСЦІ

Паўстагоддзя працуе ў мастацтве Леў Маркавіч Лейтман. У сувязі з сямідзесяцігоддзем мастака нядаўна ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адкрылася вялікая выстаўка. На жаль, яна не можа даць поўнае ўяўленне аб творчасці майстра, бо шмат яго даваенных работ загінула ў час вайны. Але і яна дае даволі ўсебаковае ўяўленне аб творчых пошуках мастака і — што вельмі важна — паказвае яго талент у развіцці прынамсі на працягу апошніх дваццаці пяці год: з часу Вялікай Айчыннай вайны і да нашых дзён.

Дарэчы, Л. Лейтман не абмяжоўваецца пейзажамі, партрэтамі, замалёўкамі. Нямала часу аддаў ён педагагічнай працы — і даўней у Віцебску, і ў апошнія гады ў Мінску. Мастак прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Яго выступленні на творчых пытаннях заўсёды прынцыповыя. Знаўца мастацтва, ён справядлівы, шчыры ў сваіх ацэнках, тэмпераментны. Мабыць, таму яго заўсёды слухаюць уважліва, яго парады і заўвагі цэняць.

Мне давялося нядаўна гаварыць з мастаком пра яго творчасць. З якім запалам казаў ён пра тое, што многія, вельмі многія свае работы яму хацелася б сёння перарабіць нанава.

— Я ведаю загадзя, што скажуць крытыкі пра мае работы. Ведаю... Але самы суровы крытык усё ж такі я сам... Я мог бы прачытаць цэлую лекцыю аб недахопах сваёй творчасці,—усміхаецца ён.

І гэта не рысоўка. Гэта імкненне глянуць на ўласны шлях з пазіцый сённяшняга ўзроўню мастацтва.

За сваё творчае жыццё Л. Лейтман зрабіў многа, і тое лепшае, што створана ім, доўга яшчэ будзе захоўваць мастацкую і эстэтычную каштоўнасць.

Яго стыхія—станковая графіка. Гэта калі гаварыць аб «тэхніцы». А замест яго твораў—жывая наша сучаснасць. Больш дакладна—унутраны свет сучасніка. У творах Л. Лейтмана не заўсёды сустрэнеш знешнія прыкметы сучаснасці або сюжэты, знешне звязаныя з сённяшнім днём. Але мастак увесь — думкамі, і пачуццямі — у нашым часе.

Можа гэта выпадковасць, што на выстаўцы побач апынуліся два пейзажы, напісаныя мастаком у розныя часы. Адзін з іх—«Цішыня», на якім маляўнічы краявід нашых дзён. І другі—«Пейзаж ваенных год». У другім пейзажы—таксама цішыня... Дзве цішыні апынуліся побач. Два розныя пейзажы, напісаныя ў розны час адным мастаком. Два розныя ўнутраныя станы аднаго і таго ж чалавека. А вось глыбіня пранікнення ва ўнутраны свет душы, шчырасць выказвання ў абедзвюх работах—аднолькавая.

Варта затрымацца каля такіх работ Л. Лейтмана, як «Магістраль», «Далі», «Дняпро. Вугальная ветка», «Рэчка Страча», «Над Нёманам», «Прадвесне», «Канец лета», «Вячэрняя цішыня», «На ўзлеску», «Беларуская восень»,— і вы пераканаецеся, што для мастака галоўнае не ў тым, каб літаральна перадаць на паперы пры дапамозе фарбаў той ці іншы пейзаж, які ўразіў яго. Для мастака перш за ўсё важна перадаць свае думкі і настрої. Думкі і настроі сучаснага чалавека. Для сваіх твораў мастак не выбірае нейкія «эфектныя» матывы прыроды, а бярэ самыя звычайныя, самыя, здавалася б, трывіяльныя. Але гэтыя нічым, здаецца, непрыкметныя палі з ляском на гарызонце, гэтыя рачулкі, гэтыя ўзлескі, гэтыя куточкі мінскіх паркаў, гэтыя віцебскія масты нібы выпраменьваюць сапраўдную прыгажосць, сапраўднае хваляванне. Глядач міжволі працінаецца гэтым настроем, які хацеў выклікаць у яго душы мастак.

У лепшых работах Л. Лейтмана адчуваецца, што талент мастака заўсёды ў развіцці. Дастаткова параўнаць такія яго работы больш даўняга часу, як «Панарама Мінска», або «Галоўны ўваход на стадыён «Дынама» ў Мінску», з мінскімі пейзажамі апошніх год, каб пераканацца, што з кожнай новай работай мастак ставіць перад сабою ўсё больш складаныя жывапісныя задачы. Справа тут не столькі ў самім жывапісе, колькі ў тых унутраных зрухах, у тым абвастрэнні погляду на з'явы прыроды, які дазваляе больш сціплымі сродкамі гаварыць пра больш складанае.

Л. Лейтман актыўна прымяняе самую разнастайную тэхніку—акварэль, гуаш, фламасцер, малюнак на таніраванай паперы і інш. І ўся гэтая «тэхніка», і сам колер арганічна ўваходзяць у структуру вобраза, гарманічна спалучаюцца ў выяўленні задумы. Мяккія, сакавітыя перапады колеру ў нацюрмортах, звонкае зіхценне фарбаў на сонцы, прыглушанасць тонаў у работах, дзе адлюстравана пахмурнае надвор'е,—і ва ўсім гэтым асноўнае—паэтычны вобраз агульнага. Сёння значна менш у мастака работ, дзе агульнае быццам засланяецца дакладнай адпрацоўкай і выпісанасцю дэталей. Усё гэта можна характарызаваць як развіццё мастака ў бок абвастрэння выразнасці.

Мне асабіста здаецца, што мастаку не заўсёды ўдаецца расказаць пра людзей так жа глыбока, як пра прыроду. Свет душы чалавечай больш глыбока ён раскрывае, як ні дзіўна можа гэта здацца, іменна ў пейзажы, а не ў партрэце. Гэта не азначае, быццам у Л. Лейтмана няма цікавых, змястоўных партрэтаў. Яны ёсць. Даволі прыгадаць хоць бы такія, як «Даярка Зінаіда Шалыка», «Школьніца-цялятніца Ніна Берасцевіч», «Партрэт дачкі» (адна з нямногіх работ маслам), «Знатная даярка Шпакоўская». Але ўсё ж мне мастак больш расказвае аб пагранічніках праз суровыя, поўныя прыгажосці, лірычнага роздуму пейзажы прыгранічных раёнаў, чым праз партрэты саміх вартавых граніц. Есць у іх, у гэтых партрэтах, і цікавыя тыпажы, і адмысловая тэхніка выканання. Але няма ў іх тае прыстраснасці мастака, таго глыбокага самавыказвання, якое так выразна выяўляецца ў невялікіх, напісаных, пэўна, у большасці адразу, у адзін сеанс, пейзажах, дзе непаўторна расказана і пра мінскія агні, і пра набліжэнне вясны, і пра позную восень, і пра слаўныя ленінскія мясціны ў Падмаскоўі, і пра зімовы іней. У кожным з эцюдаў, у кожным з завершаных лістоў—захапленне прыгажосцю прыроды. У лепшых з іх—прастата (не спрошчанасць!) і шчырасць, якія ў нашым уяўленні звязаны з тым светам вобразаў, у якіх жыве гэты чалавек і мастак.

Большасць лістоў Л. Лейтмана, створаных за апошні час, сведчаць, што ён у росквіце таленту, што вока яго па-ранейшаму вострае, што сэрца яго шырока адкрыта для новых уражанняў, што пачуццё патрабавальнасці да сябе яму не здраджвае. А гэта, відаць, самае дарагое для сапраўднага мастака.

Уладзімір БОЙКА.

Красавіцкі ЭКРАН

На зямлі няма імя больш блізкага сэрцу савецкага чалавека, чым Ленін. Нас глыбока цікавіць кожная найдрабнейшая дэталь, кожная жывая рыска ў яго шматграннай, тытанічнай дзейнасці, у яго вялікім і яркім жыцці. Паспяхова працуюць над стварэннем велічнай «Ленініяны» савецкія кінематографісты.

У красавіку на экраны рэспублікі выпускаецца новая і шыроказкранная мастацкая кінааповесць «Ленін у Польшчы» сумеснай вытворчасці кінастудыі «Масфільм» і польскага кінааб'яднання «Студыё». Работа над гэтым фільмам працягвалася каля трох гадоў. Гісторыя стварэння фільма складаная: работа, пачатая некалькі гадоў назад аўтарам сцэнарыя Яўгенам Габрыловічам і рэжысёрам Валянцінам Няўзоравым, была спынена дачаснай смерцю пастаноўшчыка. Потым за справу ўзяўся буйны савецкі рэжысёр Сяргей Юткевіч: ён стаў паўнапраўным сааўтарам сцэнарыя, разам з Габрыловічам шукаў новае вобразнае вырашэнне тэмы.

У фільме заняты савецкія і польскія акцёры. У ролі Ул. І. Леніна здымаўся народны артыст СССР Максім Штраух, Надзежду Канстанцінаўну Крупскую іграе актрыса Ганна Лісянская, яе маці, Елізавету Васільеўну, — Антаніна Паўлычава. У ролі маладога паляка Анджэя — Кішыштоф Кальчынскі, Ульні — вучаніца Катовіцкай гімназіі Ілона Кусьмерска. Здымаў карціну аператар Ян Ляскоўскі.

З цікавасцю будзе прагледжана і новая двухсерыйная шыроказкранная мастацкая кінастужка «Час, наперад!», пастаўленая на кінастудыі «Масфільм» рэжысёрам Міхаілам Швейцарам. Яна пераносіць гледача ў эпоху першай пяцігодкі, эпоху індустрыялізацыі нашай краіны. У аснову фільма пакладзены раман Валянціна Катаева, створаны пад свежым уражаннем—адзін з лепшых твораў савецкай літаратуры.

**«Вецер, вецер
на ўсім белым свеце».**

Радкі гэтыя, якія належаць Аляксандру Блоку, ні разу не вымаўляюцца ў новай шыроказкраннай карціне «Лютасць» вытворчасці Кіеўскай кінастудыі імя А. П. Даўжэнкі. Тым не менш, яны могуць паслужыць ключом да расшыфроўкі задум яе стваральнікаў. З паэмы Блока «Дванаццаць» прыйшоў у савецкую літаратуру дваццатых гадоў вобраз ветру — сімвала рэвалюцыйнай стыхіі. Сутыкненне чалавечых лёсаў на фоне супрацьборствуючых сіл прыроды маляўніча было паказана Барысам Лаўранёвым у вострасюжэтнай аповесці «Вецер». Мінула больш сарака год, і вось цяпер героі аповесці пачынаюць другое жыццё — на гэты раз у кіно.

Рэжысёр - пастаноўшчык Мікалай Ільінскі, аўтары сцэнарыя А. Сацкі і Я. Анапрыенка імкнуліся захаваць галоўныя асаблівасці літаратурнага твора — яго рамантычную прыўзнятасць, якая сцвярджае прыгажосць рэвалюцыйнага подзвігу. Ролі ў фільме выконваюць: Гулявін — Я. Мацвееў, Лёлька-атаманша — М. Валодзіна, ротмістр — І. Пераверзеў і інш.

Выпускаецца на экраны кінатэатраў новая мастацкая кінааповесць «Ваш сын і брат», пастаўленая рэжысёрам Васілём Шукшыным на Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага па матывах уласных апавяданняў «Ігнаха прыехаў», «Змяіны яд» і «Сцёпка».

У галоўных ролях заняты В. Санаеў, А. Філіпава, М. Грахава, А. Ванін, Л. Кураўлёў, Л. Рэутаў, В. Шахаў.

Убачаць гледачы і новую работу адэскіх кінематаграфістаў — шыроказкранную мастацкую кінастужку «Эскадра адыходзіць на захад». Аўтары сцэнарыя — А. Левада, М. Білінскі, рэжысёры-пастаноўшчыкі — М. Білінскі і М. Вінграноўскі. Дзеянне фільма разгортваецца ў Адэсе ў 1918 — 1919 гадах, у адзін з самых крытычных момантаў, які перажывала маладая Савецкая рэспубліка. Карціна прысвечана 50-годдзю Савецкай улады.

Пецярбург... Сюды ў 1847 годзе прыехаў французскі танцор Марыус Пеціпа. Прыехаў, каб застацца назаўсёды і паставіць на сцэне Марыінскага тэатра балеты «Спячая прыгажуня», «Жызель», «Шчаўкунчык» і іншыя, якія потым атрымалі сусветную вядомасць.

Тут, у Пецярбургу, Марыус Пеціпа сустрэўся з вялікім рускім кампазітарам Пятром Ільічом Чайкоўскім. Плён іх сумеснай работы і імкнуліся перш за ўсё падкрэсліць аўтары новай каляровай шырокафарматнай кінакарціны «Трэцяя маладосць», створанай кінематаграфістамі «Ленфільма» сумесна з французскімі калегамі (сцэнарый А. Галіча і П. Андрыота, пастаноўка Жана Дрэвіля). У ролі Марыуса Пеціпа здымаўся Жыль Сегаль, у ролі П. І. Чайкоўскага — Алег Стрыжэнаў. У астатніх ролях заняты Жак Фер'ер, Наталля Вялічка, Мікалай Чаркасаў, Ала Ларыёнава і іншыя.

У красавіку на экранах рэспублікі будуць таксама дэманстравацца новыя мастацкія кінафільмы «Будуецца мост» (кінастудыя «Масфільм»), «Прымаю бой» (кінастудыя «Ленфільм»), «Мсье Жак і іншыя» (кінастудыя «Арменфільм»), «Іншаземка» (Адэская кінастудыя).

...Іван Сяргеевіч Траўкін нічым асабліва не вылучаўся сярод сваіх таварышаў па працы — работнікаў завода безалкагольных напіткаў, калі б не... трыццаць трэці зуб, які нечакана ўбачыў у яго зубы ўрач. Так Траўкін стаў славутасцю. Пра цікавыя прыгоды, звязаныя з фантастычным трыццаць трэцім зубам Траўкіна, і расказвае новая шыроказкранная сатырычная кінакамедыя «33», створаная рэжысёрам Г. Данелія на кінастудыі «Масфільм» па ўласным сцэнарыі, напісаным у садружнасці з В. Яжовым і В. Канецкім. У галоўных ролях заняты папулярныя кінаакцёры Я. Ляонаў, Н. Мардзюкова, В. Аўдзюшка, С. Святлічная і іншыя.

Пра першае юнацкае каханне, пра шчодрасць людскіх сэрцаў, пра чысціню чалавечай душы раскажа гледачам новая грузінская кінакарціна «Я бачу сонца». Рэжысёр-пастаноўшчык Лана Гогаберыдзе. У аснову фільма пакладзены аднайменны раман Нодара Думбадзе.

З зарубежных кінастужак у красавіку будуць дэманстравацца: румынская — «Дынастыя непакорных»; венгерская — «Так я прыйшоў» і «Дваццаць гадзін»; польская — «Першы дзень свабоды»; югаслаўская — «Анрываўленая кашуля»; бразільская — «Загубленыя жыцці»; амерыканская — «Паўночны пацалунак» і іншыя.

Кадр з кінафільма «Лютасць».

СПЯВАЮЦЬ НАСТАЎНІКІ

Харавы калектыў мастацкай самадзейнасці саўгаса «Абчуга» добра ведаюць у нашым раёне. Дзесяткі канцэртаў на сцэне саўгаса, неаднаразовыя выезды ў суседнія саўгасы і калгасы — «40 год Кастрычніка», «Чырвоны Кастрычнік», «Слабада», «Ухвала», паездкі ў Талачынскі раён, удзел у раённых, абласных і рэспубліканскіх аглядах — гэта далёка не поўны пералік таго, што робяць аматары сцэны.

У канцэртных праграмах нашага хору пераважаюць песні аб партыі і Леніне, беларускія народныя песні «Сямёра жаніхоў», «Прымакі», «Ці я ў лузе не травіца расла», танцы «Лявоніха», «Крыжачок», «Гапак»...

Многа гадоў калектывам кіравала настаўніца Ганна Мікалаеўна Сафонава. Цяпер яна ўжо на заслужаным адпачынку, але, як і раней, прымае актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці. У хоры ў нас новы кіраўнік — Зінаіда Лук'янаўна Чацвярэнька, настаўніца школы — сама танцорка, салістка, музыкант, чытальнік. Немалая заслуга Зінаіды Лук'янаўны ў тым, што нашы самадзейныя артысты нядаўна з поспехам выступілі на раённай сцэне з творчай справаздачай.

Аднак хацелася б, каб у хоры ўдзельнічала не 40 чалавек, як сёння, а значна больш.

Аснову калектыву мастацкай самадзейнасці складаюць настаўнікі сярэдняй школы, якія любяць песню, умеюць выконваць і народныя танцы. У саўгасе многа камсамольцаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, медработнікаў. Але, на жаль, яны не ўдзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці.

Есць у нас і школьны хор. Сярод вучняў таксама нямала добрых танцораў і чытальнікаў, якія не раз выступалі з канцэртамі ў саўгасе, выязджалі ў суседнія калгасы. Цяпер юныя аматары самадзейнай сцэны актыўна рыхтуюцца да раённага агляду.

На жаль, саўгасная мастацкай самадзейнасці мала дапамагае раённы Дом культуры. Добра было б, каб мастацкі кіраўнік Дома культуры і хтонебудзь з выкладчыкаў музычнай школы хоць зрэдку прыязджалі на нашы рэпетыцыі. Іх кваліфікаваная дапамога спрыяла б творчаму росту калектыву.

І. РАБКОЎ,
настаўнік Абчугскай сярэдняй школы Крупскага раёна.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Героі папулярнага рамана «Сэрца на далоні», якіх ужо бачылі тэатральныя гледачы Гомеля, Гродна і Віцебска, днямі зажылі і на падмостках Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМБ. Паставіў спектакль галоўны рэжысёр тэатра заслужаны артыст БССР Г. Волкаў. Рэжысёр — Ул. Серафімовіч.

Брэсцкая прэм'ера зноў пацвердзіла, наколькі актуальныя праблемы, узнятыя аўтарам рамана, які ў сааўтарстве з Ю. Арынянскім зрабіў інсцэніроўку свайго твора.

Вартасці спектакля вызначаюць удумлівая рэжысура і зладжаны ансамбль акцёраў-выканаўцаў: заслужаных артыстаў БССР М. Абрамава (Гукан), С. Яўдошанкі (Яраш), Ю. Уласава (Шыковіч), С. Юркевіча (Наведвальнік), А. Астo рынай (Сухадол), заслужанага артыста БССР і Літ. ССР А. Логінава (Тарасаў), артыстаў Р. Семічавай (Зося), Ул. Кулішава (Сербантоўскі), Э. Собалевай (Маша), Ул. Траццякова (Славік), В. Пестунова (Швагераў) і інш.

Спектакль афарміў мастак А. Марозаў, музыка народнага артыста СССР кампазітара Я. Цікоцкага.

1 красавіка на прэм'еры прысутнічалі аўтар твора Іван Шамякін, беларускія драматургі Андрэй Макаёнак, Алесь Кучар і тэатральны крытык Г. Колас.

У Дзяржаўным Вялікім акадэмічным тэатры оперы і балета адбылася прэм'ера балета А. Адана «Жызель». Пастаноўка Н. Фёдаравай.

На здымку—сцэна са спектакля. Жызель—народная артыстка БССР Н. Давыдзенка, Альберт—народны артыст БССР Б. Давыдаў.

Фота А. КАЛЯДЫ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

5 красавіка

Першая праграма. 11.00 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 11.30 — «Мільёны, здабытыя ў лабараторыі» (М). 12.10 — «Галы, ачкі, секунды» (М). 12.30 — «Музычны кіёск» (М). 13.00 — Масква ў дні з'езда (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Тут-і-Там падарожнічае». Перадача з Кіева. 17.30 — «Вясна на ВДНГ» (М). 18.00 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 18.20 — для малышоў. «Як самому зрабіць цацкі». 18.45 — для школьнікаў. «І няма канца мары». Кінанарыс. 19.00 — сусветная грамадскасць пра XXIII з'езд КПСС. Выступленне каментатара па знешнепалітычных пытаннях В. А. Шэўлака. 19.15 — тэлевізійныя навіны. 19.35 — для слухачоў пачатковых палітшкол. Адказы на пытанні па тэме «Перамога сацыялізма ў СССР» (М). 19.55 — гутарка з дэлегатамі XXIII з'езда КПСС (М). 20.10 — С. Ласкін. «Дзеля другіх». Прэм'ера тэлеспектакля. Перадача з Ленінграда 21.30 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 22.00 — канцэрт эстраднага аркестра Усесаюзнага радыё і тэлебачання (М). 22.40 — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 18.20 — «Першая Бастылія». Мастацкі фільм (М). 19.35 — да Сусветнага дня здароўя. Перадача першая. 20.15 — «Будзьце вясёлыя». Фільм-канцэрт.

6 красавіка

Першая праграма. 11.10 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 11.30 — для школьнікаў. «Вясёлы карабель». Перадача з Калінінграда. 21.10 — канцэрт эстраднага аркестра Усесаюзнага радыё і тэлебачання (М). 12.50 — Масква ў дні з'езда (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 17.30 — для малышоў. «У некаторым царстве». Мультыплікацыйны фільм. 18.00 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 18.20 — тэлевізійныя навіны. 18.40 — канцэрт Закарпацкага народнага хору. 19.40 — гутарка з дэлегатамі XXIII з'езда КПСС (М). 19.55 — школьная фільматэка. «Белее ветразь адзінокі». Мастацкі фільм. 21.30 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 22.00 — «Ля кінаафішы». Красавіцкі экран. 22.40 — тэлевізійныя навіны (М).

Другая праграма. 17.30 — «Навука — вытворчасці» (М). 18.00 — «Народжаныя ў агні». Кінанарыс. 18.20 — «Знаёмства з операй». Савецкае оперное мастацтва (М). 19.40 — «Букет кветак». Кароткаметражны фільм. 19.55 — «Наш дом». Мастацкі фільм (М). 21.30 — да Сусветнага дня здароўя. Перадача другая. 22.00 — канцэрт Дзяржаўнага Краснаярскага ансамбля танца Сібіры (М).

7 красавіка

Першая праграма. 11.00 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 11.30 — «На прасторах Радзімы» (М). 11.50 — народныя музычныя інструменты. Перадача з Тбілісі. 12.20 — Масква ў дні з'езда (М). 16.35 — праграма перадач. 16.40 — «Займальная азбука». «Літары «М» і «Н» (М). 17.10 — для школьнікаў. «Пра кніжку новую вядзём размову». Р. Барадулін. «Красавік». 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — дзённік XXIII з'езда КПСС (М). 18.20 — «Свет сёння» (М). 19.00 — канцэрт (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — у нас у гасцях народная артыстка РСФСР Ірына Бугрымава. 22.40 — «Белыя і чорныя». Шахматна-шашачны клуб. Вядзе перадачу гросмайстар А. Суэцін.

Другая праграма. 19.25 — «Навука пра рак». Прэс-канферэнцыя вучоных і адказы на пытанні тэлегледачоў. 20.40 — «Малахаў курган». Мастацкі фільм. 22.00 — «Мастак». Дакументальны кінанарыс (М). 22.30 — «Музычны маяк» (М).

Наступны нумар газеты «Літаратура і мастацтва» выйдзе 7 красавіка.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНЬКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Міністэрства культуры БССР з жалем паведамляе аб заўчаснай смерці намесніка дырэктара Дзяржаўнага цырка БССР Рыгора Андрэевіча ТАЛСТОВА і выказвае глыбокае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25 25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 00851